Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 СНЕЖНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 232
(26345)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у жалобных мерапрыемствах у Маскве ў сувязі са смерцю Аляксія II

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8-9 снежня зробіць візіт у Расійскую Федэрацыю, дзе прыме ўдзел у жалобных мерапрыемствах у сувязі са смерцю Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II.

Патрыярх Аляксій II заўсёды карыстаўся ў беларусаў вялікім аўтарытэтам і павагай. Ён неаднаразова наведваў Беларусь. Апошні візіт у Беларусь Патрыярх зрабіў у кастрычніку ў дні ўрачыстасцяў з нагоды 1020-годдзя Хрышчэння Русі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Эканамічную сітуацыю ў Мінску будзе кантраляваць Каардынацыйны савет Мінгарвыканкама

**Каардынацыйны савет па маніторынгу эканамічнай сітуацыі створаны ў Мінгарвыканкаме, паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.**

Паводле яго слоў, савет будзе кантраляваць сітуацыю ў Мінску, адсочваць тэндэнцыі і прымаць меры па вырашэнні праблем, што ўзнікаюць. Узначаліў новую структуру Міхаіл Паўлаў.

«Стварэнне такога савета не сведчыць аб нейкай надзвычайнай сітуацыі ў горадзе», — растлумачыў мэр сталіцы. У той жа час у прадпрыемстваў існуюць праблемы з разлікамі, платай за пастаўленую прадукцыю. Таму Каардынацыйны савет, адзначыў ён, «будзе трымаць сітуацыю пад кантролем».

«Нам сёння нельга зніжаць тэмпы эканамічнага развіцця, таму што ад гэтага залежыць дабрабыт людзей. Нам трэба будаваць жыллё, сацыяльныя аб'екты. Неабходна сур'ёзную ўвагу ўдзяляць рэканструкцыі дарог. Таму тыя планы, якія зацверджаны ў Мінску, павінны быць рэалізаваны», — дадаў Міхаіл Паўлаў.

**БЕЛТА.**

«Прамая лінія»

## ПЕНСІІ: УСЁ, ШТО ВАМ ЦІКАВА

Пенсійная тэма — актуальная заўсёды. І сведчаннем гэтага становяцца званкі ў рэдакцыю, вынікам якіх стала рашэнне правесці чарговую «прамую лінію» са спецыялістамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Асаблівасці падліку стажу, індывідуальнага каэфіцыента, надбаўкі, магчымасці датэрміновага выхаду на заслужаны адпачынак — аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць з **намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валерыем Валер'евічам КАВАЛЬКОВЫМ.**

Наша «прамая лінія» ***адбудзецца 12 снежня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.***

«Прамая лінія»

## Далоў камяні... І цыстыт, і прастатыт

**17 снежня, у сераду, з 14.00 да 15.00** у рэдакцыі газеты на пытанні аб прафілактыцы і лячэнні мочакаменнай хваробы, дабраякаснай гіперплазіі прастаты, нетрымання мачы, запаленчых хваробаў мочапалавой сферы — прастатытаў, піеланефрытаў, цыстытаў адкажа **загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр Уладзіміравіч СТРОЦКІ.**

***Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).***

## КДК Беларусі выявіў парушэнні ва ўсіх 17 праверавых рыэлтарскіх арганізацыях

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі ў жніўні-лістападзе гэтага года праверыў 17 рыэлтарскіх арганізацый і практычна ва ўсіх выявіў парушэнні правілаў ажыццяўлення рыэлтарскай дзейнасці, зацверджаных указам № 15 ад 9 студзеня 2006 года. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе КДК.**

У некаторых арганізацыях зафіксаваны факты несвоечасовай выплаты зарплаты. Пры гэтым у дзесяці (58,8 працэнта) сярэднямесячная зарплата работнікаў у 2008 годзе склала менш як Br390 тыс. У большасці праверавых суб'ектаў гаспадарання выяўлена значная колькасць скасаваных без аплаты дагавораў на аказанне рыэлтарскіх паслуг. Як адзначылі ў КДК, невысокі ўзровень аплаты працы работнікаў арганізацый і нездавальняючыя фінансавыя вынікі іх работы (у 2008 годзе амаль палавіна праверавых суб'ектаў маюць страты) ставяць пад сумненне праўдзівасць адлюстравання ва ўліку фактычна аказваемых паслуг. Гэтыя факты таксама даюць падставы меркаваць, што асобныя фірмы не звяртаюць увагі на новую сістэму аплаты рыэлтарскіх паслуг і па-ранейшаму ўтойваюць выручку, якую атрымліваюць. На думку прадстаўнікоў Камітэта дзяржкантролю, адным з фактараў, які стрымлівае рэальнае адлюстраванне выручкі, з'яўляецца адсутнасць заканадаўчай нормы, што дазваляе адносіць на затраты ўзнагароджанні рыэлтарам і агентам па аперацыях з нерухомай маёмасцю, якія выплачваюцца ў працэнтах ад паступіўшай выручкі за аказаныя паслугі.

За выяўленыя парушэнні суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці і вінаватыя службовыя асобы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму Br31,8 млн. Цяпер разглядаецца пытанне аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці 6 рыэлтарскіх арганізацый і іх службовых асобаў.

**БЕЛТА.**

## На лініі драцяной агароджы в/ч масава гінула дзікая жывёла

**За 2007 і 2008 гады, згодна з журналамі ўліку адключэнняў электрызаванай драцяной агароджы двух аб'ектаў воінскай часці 25819, загінула 57 дзікіх жывёлін, у тым ліку 12 дзікоў, 20 казуль, 12 ліс, 8 зайцаў, яшчэ ў 5 выпадках від загінулай жывёлы не быў указаны.**

Апошні выпадак адбыўся зусім нядаўна: егер прадпрыемства «Ваенпаляванне» паведаміў у Стаўбцоўскую міжрайінспекцыю пра масавую гібель на працягу некалькіх сутак дзікоў. На лініі электрызаванай драцяной агароджы в/ч загінулі 7 дзікоў, у тым ліку дзве дарослыя асобіны і пяць парсючкоў. Супрацоўнікамі міжрайінспекцыі сумесна з работнікамі Стаўбцоўскага лясгаса і райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў прысутнасці намесніка начальніка штаба в/ч 25819 са знешняга боку быў праведзены агляд стану драцяной агароджы ахоўных аб'ектаў. Устаноўлена, што стан знешняй агароджы з калючага дроту дазваляе жывёлам без праблем трапляць на лінію электрызаванай драцяной агароджы, дзе яны і гінуць, што парушае існуючыя патрабаванні.

Паводле інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, камандаванне в/ч і кіраўніцтва «Ваенпалявання» ведала пра такія факты, аднак ніякіх канкрэтных мераў не прымала. Цяпер для выпраўлення сітуацыі камандаванню в/ч рыхтуецца прадпісанне. А на стаўбцоўскім участку вышэйназванага прадпрыемства, паводле хадайніцтва начальніка Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі, старшыня мясцовага райвыканкама прыняў рашэнне аб зніжэнні ліміту здабычы дзікіх капытных жывёл на гэты год (на 11 дзікоў і 9 казуль).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Браканьеры-міліцыянеры...

**Фактамі браканьерства на вадаёмах, на жаль, нікога не здзівіш. Час ад часу пэўную цікавасць могуць выклікаць хіба толькі дзеючыя асобы.**

Вось і нядаўна работнікамі Аршанскай міжрайінспекцыі на рацэ Мерэя Дубровенскага раёна былі затрыманы грамадзяне, што знаходзіліся на беразе з забароненымі прыладамі рыбалоўства — сеткамі. Усяго было канфіскавана 9 сетак агульнай даўжынёй 150 метраў. А затрыманыя аказаліся грамадзянамі Расійскай Федэрацыі: службоўцы УУС г. Смаленска, старшына міліцыі, міліцыянер-кінолаг і капітан міліцыі з аддзела кадравага ўпраўлення. На парушальнікаў складзены адміністрацыйныя пратаколы, якія накіраваны для разгляду ў суд Дубровенскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Куды глядзелі інспектары?

**Работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі на возеры Беража Браслаўскага раёна праверылі рыбалоўную брыгаду дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». І што?**

Было ўстаноўлена, што ўлоў у колькасці 255 кілаграмаў, здабыты брыгадай на возеры, не ўзважаны, гэта інфармацыя не ўпісана ў тоневы журнал. Здабытая рыба без афармлення таварна-транспартнай накладной у прысутнасці інспектараў прыродаахоўнай установы была вывезена на службовым аўтамабілі за межы рыбалоўных угоддзяў. На месца выклікалася міліцыя, цяпер праводзіцца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




**Моцныя снегапады, мяркуюць сіноптыкі, пройдуць на гэтым тыдні ў Магілёўскай і Гомельскай абласцях, дзе-нідзе з завірухай і галалёдам. А ў цэлым па краіне тэмпратурны фон зменіцца нязначна. Ноччу будуць назірацца невялікія маразы, удзень — ад -3 да +2 градусаў. Потым зноў стане сыра, выпадуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.**

Фота БЕЛТА.

## Дзед Мароз чакае заказы...

**47 тысяч паштовых падарункаў ад Дзеда Мароза падрыхтавалі сёлета работнікі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта».**

Паштовы падарунак ад Дзеда Мароза ўключае набор з 12-ці шакаладак (з літараў на іх абгортках лёгка складваецца навагоднее віншаванне), фламастары, набор паштовых картак-размалёвак, якія можна ператварыць у сапраўдныя віншавальныя паштоўкі, паштоўку-цацку, з якой з дапамогай нажніц і клею можна зрабіць фігурку вясёлага пінгвіняняці, і мяккую цацку — бычка, сімвал надыходзячага года.

Замову на атрыманне дзіцем па пошце арыгінальнага навагодняга падарунка можна аформіць у любым паштовым аддзяленні па 27 снежня ўключна. Прычым «Белпошта» гатова прыняць замову ад любой установы адукацыі: школы або дзіцячага садка. Кошт замовы для беларускіх адрасатаў складзе 18 тысяч рублёў. А дастаўляцца падарункі будуць непасрэдна напярэдадні навагодніх святаў, пачынаючы з 22 снежня. Таксама віншаванне ад беларускага Дзеда Мароза можна будзе накіраваць у краіны бліжняга і дальняга замежжа. Але з афармленнем замовы трэба пасяпшацца — зрабіць заяўку трэба не пазней, чым 15 снежня. Гэта звязана з хуткасцю дастаўкі міжнароднай карэспандэнцыі, асабліва ў перадсвяточныя дні. Для адрасатаў у Расіі, Літве і Туркменістане паштовы падарунак будзе каштаваць 23 300 рублёў, а ва ўсе іншыя краіны — 33 520 рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Кірмашоў стане болей

**У Віцебску прайшоў аптовы кірмаш, у якім бралі ўдзел усе вытворцы харчовых тавараў Віцебскай вобласці і кіраўнікі мясцовых гандлёвых арганізацый.**

Як паведаміў «Звяздзе» намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар Нікалайкін, кірмаш прайшоў вельмі эфектыўна. Гандляры маглі без пасрэднікаў азнаёміцца з навінкамі прадукцыі і заключыць дамовы. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец даў каманду павялічыць колькасць кірмашоў, якія будуць арганізаваны для насельніцтва. Пройдуць яны і ў раённых цэнтрах, буйных населеных пунктах. Вытворцы рэгіёна плануюць арганізаваць кірмашы і ў суседніх краінах, у тым ліку ў Латвіі і Літве. Там вельмі зацікаўлены ў іх правядзенні, бо вядома, што беларускія прадукты і тавары параўнальна высокай якасці і больш даступныя па кошце.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НАВАГОДНІЯ АЎТАКРАМЫ

Каб жыхары далёкіх вёсак не мелі ніякіх праблем у падрыхтоўцы да сустрэчы калядных і навагодніх святаў, арганізаваны прыём заказаў прадуктаў харчавання. І торт святочны, і шампанскае і іншае прывязуць — усё, што трэба. Аўтакрамы прыедуць у святочным афармленні.

Як паведаміў «Звяздзе» **старшыня Віцебскага абласнога саюза спажывецкіх таварыстваў Гадад ГАЛІМАЎ,** аўтакрамы абслугоўваюць 460 вёсак з насельніцтвам менш як 50 чалавек у кожнай. Цяпер працуюць 133 аўтакрамы. Сучасныя аўтакрамы — гэта не ўсім прывычныя фургон, яны маюць спецыяльнае тэхналагічнае і халадзільнае абсталяванне. Пакуль што аўтакрамы, згодна з патрабаваннямі адпаведнага стандарту, прыязджаюць у вёску не менш чым 2 разы штотыдзень. Плануецца — тры. Улічваючы, што кожная сучасная аўтакрама каштуе каля 80 мільёнаў рублёў, больш частых прыездаў крамаў на колах давядзецца пачакаць. Неабходна яшчэ мінімум 50 крамаў на колах. На жаль, спажывецкая кааперацыя не можа ўласнымі сіламі хутка вырашыць гэтае пытанне з-за фінансавых цяжкасцяў. Паводле слоў Гадада Галімава, было б нядрэнна, каб у Віцебскім аблвыканкаме, напрыклад, аб'явілі аб правядзенні акцыі — «Новыя аўтакрамы вёскам». Простыя вяскоўцы, безумоўна, будуць за гэта вельмі ўдзячныя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка общей площадью 0,1113 га в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Новоселки Острошицко-Городокского сельсовета Минского района. Начальная цена – 20 000 000 бел. рублей. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2008 г. Аукцион состоится **18.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

Ліст у нумар

## Якой шкалой вымераць гэту бяду?

Паважаная Вольга Мядзведзева, на жаль, не ведаю вашага імя па бацьку, што ўскладняе нашы зносіны нават у пісьмовай форме. Але выкласці свае думкі на аркушы паперы, на мой погляд, трэба, хоць штосьці «трымае за руку», пісаць не пісаць, напэўна гэта з серыі «мая хата з краю», бо за гады ўзнікшы недавер да вас, журналістаў, якія ў асноўным пішуць пад заказ, і нават калі з імі ўступаеш у кантакт, адкрыешся, так бы мовіць, то ў выніку ўсё сказаць ці недагаворыць. Таму кантактаваць з вашым братам асабіста ў мяне апошнім часам ніякага жадання няма. У тым ліку і з газетай «Звязда». Гэта не тая газета, часоў вайны або развітога сацыялізму. Але раптам нешта змянілася. Гэта нешта і прымушае мяне вадзіць ручкай па белым аркушы. Усяму віной ваш артыкул, Вольга. Называецца «Праз 20 гадоў...» Як гаварыў вялікі акцёр, шляхам трапнага пападання... ваш снарад трапіў прама ў сэрца. Тое, што я прачытаў, выклікала буру эмоцый. Прабачце, але 65-гадовы мужчына праслязіўся. Прычына?! Усё тое, што вы, паважаная, выклалі ў артыкуле — праўда. За некалькі хвілін перад вачамі прайшлі гэтыя 20 гадоў. Так, я пацвярджаю, тое, што здарылася ў армянскіх гарадах Спітаку і Ленінакане, для ўсіх савецкіх людзей — і беларусаў, і рускіх, і ўкраінцаў, і малдаван, і прыбалтаў, і каўказцаў, і людзей з сярэднеазіяцкіх рэспублік, людзей усіх нацыянальнасцяў, веравызнання — стала трагедыяй. Плакалі, гледзячы тэлевізар, чытаючы газеты, не толькі лідары краіны, не толькі забітыя горам армяне, але плакала ўся краіна. Гэта факт!

І таксама факт, тады мы ўсе былі разам. Мы разам перажывалі агульнае гора, што, упэўнены, у кожнай армянскай сям'і прымалася з удзячнасцю. Мяне глыбока закрануў ваш, паважаная Вольга, і вашага мужа (дарэмна ў артыкуле вы не ўзгадалі яго імя) парыў. Парыў маладосці, але маладых людзей, выхаваных на традыцыях: чалавек чалавеку — сябар і брат. Так было. І калі не ўсе былі такія адважныя, як вы, то смею вас запэўніць, душой і сэрцам усе былі там.

Праз усё вамі выпакутаванае пасланне чырвоным радком праходзіць шкадаванне аб тым, што стала з нашай вялікай краінай. Гэта таксама — землятрус, гэта таксама — бяда. На жаль, вярнуць назад тое, што зрабілі п'яніцы, нацыяналісты і здраднікі-кіраўнікі, якія пажадалі стаць удзельнымі бажкамі, нельга. Але мы, простыя людзі, не павінны забываць, што толькі разам мы — сіла. Калі нашы кіраўнікі будуць цягнуць коўдру на сябе, не лічачыся з патрэбамі суседзяў, ды і сваіх людзей, бяды яшчэ большай не прамінуць. Заакіянскія «акулы» не дрэмлюць.

Таму шчыра дзякую вам, Вольга, за мудры, своечасовы і вельмі патрэбны ўспамін аб падзеях 20-гадовай даўнасці, які, я думаю, не толькі мяне схіліў да разважанняў.

З павагай і пажаданнямі вам і вашай сям'і здароўя, дабрыні, міру і поспехаў.

**Генадзь ЗАГАРЭЙ,** *г. Слуцк.*

## Чаму так доўга не вяртаюць банкаўскую картку?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Яшчэ 21 лістапада ў мінчаніна Дзмітрыя Дайнекі банкамат «праглынуў» яго картку. Хлопец адразу патэлефанаваў у «свой» банк, каб картку заблакавалі. Што і было аператыўна зроблена. А вось так жа аператыўна атрымаць яе назад у заяўніка чамусьці не атрымалася. Не мае карткі на руках ён і да гэтага часу.**

Магчыма, сітуацыю некалькі ўскладняе тое, што картку выдаў адзін банк, а банкамат, які яе «праглынуў», належыць іншаму? Але ўсё роўна — ці не занадта вялікі тэрмін, асабліва калі ўлічыць, што ўсе падзеі адбываюцца на тэрыторыі аднаго горада? У «чужым» банку хлопцу адказваюць, што картку ўжо выслалі на адрас «роднага» банка, але ў «сваім» толькі разводзяць рукамі, маўляў, нічога не атрымлівалі. А як чалавеку некалькі тыдняў жыць без грошай?

Паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення плацежнай сістэмы Нацыянальнага банка Івана Пішчыка, якому мы адрасавалі пытанні заяўніка, нейкіх вызначаных нарматываў па вяртанні банкаўскай карткі кліенту няма. «Трэба глядзець дамову паміж банкам і трымальнікам карткі — што па гэтым пытанні ў ім пазначана». Далей Іван Аляксеевіч пагадзіўся, што тэрмін «невяртання» ў нашым выпадку сапраўды занадта працяглы. «Магчыма, справа ў так званым чалавечым фактары? Звычайна патрэбны дзень-два».

Далей суразмоўца параіў заяўніку або звярнуцца са скаргай да кіраўніцтва «свайго» банка, або выкласці яе на адрас Нацыянальнага банка. Зразумела, будзе праведзена праверка, у тым ліку і па высвятленні прычын, чаму банкамат «праглынуў» картку, ці няма ў гэтым віны самога карыстальніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Пі сваё!

## Першыя сокі ва ўпакоўцы «прызма»

**Адзін з буйнейшых вытворцаў сокаў у Беларусі — ІП «Старая крэпасць» з Бабруйска — распачаў выпуск сокаў Prigat у супрацоўніцтве з міжнароднай кампаніяй Prigat International Limited.**

Гэта сокавы брэнд у сегменце прэміум і адначасова першы сокавы брэнд, выпуск якога засвоены ў Беларусі ў супрацоўніцтве з міжнароднай кампаніяй. Prigat прызваны «пасунуць» у сегменце прэміум расійскіх і ўкраінскіх вытворцаў, якія фактычна манапалізавалі гэты перспектыўны сектар беларускага рынку. Новыя сокі беларускай вытворчасці пачалі паступаць у гандлёвую сетку краіны.

«Мы прадаём Prigat ва ўпакоўцы Tetra Prism аб'ёмам адзін літр ужо на тэрыторыі ўсёй краіны. Гэта першыя сокі ў Беларусі, якія будуць выпускацца ў прэміяльнай упакоўцы тыпу «прызма». Прадукт выпрабляецца з сыравіны, якасць якой кантралюе наш партнёр. Цяпер на рынак выведзены сокі 6 смакаў, але гэта толькі пачатак нашага супрацоўніцтва. У бліжэйшы час мы плануем пашырыць асартымент прадукцыі», — сказаў дырэктар ІП «Старая крэпасць» Віталій Бялоў. Дарэчы, прадпрыемства з красавіка гэтага года вырабляе сокі пад уласным брэндам «Сака-віты фрукт». Яны прадаюцца ва ўпакоўцы Tetra Brik ёмістасцю адзін і два літры.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Рэпартаж з колаў

# «ТРЭБА ЧАСЦЕЙ СУСТРАКАЦЦА!»

Да канца снежня яшчэ некалькі тыдняў, і казачныя Дзяды Марозы толькі-толькі пачынаюць прымяраць свае чырвоныя кажухі, а Снягуркі пакуюць мяхі з падарункамі. Іншая справа, што «звяздоўскаму дэсанту» чакаць Новага года няма калі — прызы нашым падпісчыкам трэба дастаўляць ужо цяпер. Таму літаральна без паўзы працягваецца вандроўка па розных кутках Беларусі, у якіх жывуць нашы сябры — чытачы. Гэтым разам шлях ляжаў на Брэстчыну, а дакладней — у Пінск, дзе ўжо зачакаўся каляровага тэлевізара Сцяпан Баранюк.

Зрэшты, па добрай завядзёнцы мы не сталі абмяжоўвацца адным толькі візітам у Пінск, і па дарозе пастараліся зазірнуць яшчэ ў колькі райцэнтраў — пагутарыць з прадстаўнікамі мясцовых уладаў, пакінуць фірменныя звяздоўскія сувеніры найбольш руплівым паштальёнам у раённых вузлах паштовай сувязі...

У Клецку, Ганцавічах, Лунінцы, Іванава, Кобрыне кіраўнікі РВПС амаль аднагалосна засведчылі: падпіска ідзе па звыклай схеме — крыху больш марудна ў горадзе, больш актыўна па раёне. Прадстаўнікі вертыкалі таксама сведчылі, што хваляваца за вынікі падпісной гонкі пакуль што рана — але і сядзець склаўшы рукі нельга. Многія падпісчыкі з прыняццем рашэння цягнуць да апошняга моманту — ці то чакаюць атрымання зарплат ды пенсій, ці ўвогуле разважаюць: мо ва ўмовах няўхільнага крызісу лепш зэканоміць на духоўным сілкаванні... А мо справа зусім у іншым — прыглядаюцца людзі да розных выданняў, ацэньваюць перавагі? «Я і сам выпісваў спачатку адну газету, потым перайшоў на іншую — параўноўваю, выбіраю, — пагаджаецца з нашым меркаваннем начальнік Ганцавіцкага РВПС Міхаіл Пішч. — Так і кожны чытач шукае, дзе асабіста для яго інфармацыя цікавей».



...З усімі дарожнымі прыгодамі мы нават пачалі перажываць, каб не спазніцца ў Пінск, дзе на дзве гадзіны была прызначана сустрэча ў зале пасяджэнняў выканкама. Але тактыка «язык да Кіева давядзе» зноў не падвяла, і з запасам у некалькі хвілін «звяздоўскі дэсант» прыбыў у пункт прызначэння. «Прызёр наш хоць змог прыехаць?» — хваляваліся калегі. — «Тут ён, тут, — супакоілі нас спецыялісты ідэалагічнага аддзела Пінскага гарвыканкама. — Вунь інтэрв'ю нашаму мясцоваму тэлебачанню дае».

Сцяпан Васільевіч Баранюк — менавіта яму ўсміхнулася ўдача ў падпіснай латарэі — расказаў, што выпісвае газету больш як 30 гадоў. А калі дакладней, з 1975 года. І гэта сяброўства з выданнем склалася неяк адразу — калі ад астатніх выданняў, якія выпісваў, наш чытач пакрысе адмовіўся, то «Звязда» ў доме так і засталася, адзіная. «Падабаецца мне газета, змест яе, — крыху разгублена тлумачыў Сцяпан Васільевіч вялікай аўдыторыі такую вернасць. — Практычна ў кожным нумары знаходжу што-небудзь цікавае і карыснае. Ну і мова, канешне, гаворыць на карысць выбару — хоць сам я ў асноўным размаўляю па-руску, а то і на «трасянцы», але лічу, што каранёў губляць не трэба, варта памятаць аб сваім паходжанні». Апошнія два гады Сцяпан Васільевіч спрабаваў шчасця ў звяздоўскай латарэі, але ўсе ніяк не шанцавала, а тут — раз, і прачытаў у «Звяздзе» пра сваю ўдачу. Адразу паверыў старой сяброўцы — газеце, і запэўніў нас, што тэлевізар у доме лішнім не будзе: «Для такога падарунка заўжды месца знойдзецца!».



А нас прыемна ўразіла не толькі выпрабаванае часам сяброўства — тое, што «Звязду» многія выбіраюць раз і назаўжды, ведаем даўно — але перспектывы на будучыню. Вось простае назіранне: на сустрэчы прысутнічалі выкладчыкі і студэнты Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Апошнія ,чуваць было, спачатку гаманілі пра нешта сваё па-руску. А ўжо пры развітанні — пасля таго, як больш даведаліся пра гісторыю і сучасны стан газеты, актыўна паўдзельнічалі ў «звяздоўскай» віктарыне, і, дарэчы, многія выйгралі памятныя сувеніры, — казалі «дзякуй». Па-беларуску.

«Трэба часцей прыязджаць, ладзіць падобныя сустрэчы — вось пабачыце, тады многія і размаўляць будуць па-беларуску, і беларускамоўныя выданні пачнуць чытаць больш актыўна! Падпіска ў некалькі разоў вырасце», — заўважыла на сустрэчы кіраўнік ідэалагічнага аддзела Пінскага гарвыканкама Валянціна Кулак. Мы і не супраць, бо схема гэта дзейнічае проста: больш чытачоў на Піншчыне — больш удзельнікаў падпісной латарэі — больш прызоў, якія мы з задавальненнем уручым сябрам-чытачам. Так што — бачыце? — частата сустрэч залежыць ад абодвух бакоў...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК,**
**Уладзімір ЗДАНОВІЧ,**

Мінск—Клецк—Ганцавічы—Лунінец—Пінск—Іванава—Драгічын—Брэст—Кобрын—Баранавічы—Мінск.

***P.S.*** *Адзінай лыжкай дзёгцю ў гэтай вандроўцы сталі дарожныя блуканні ў пошуках знакаў-паказальнікаў на той ці іншы горад. Дзіўна, але ў некаторых райцэнтрах Брэсцкай вобласці ёсць паказальнікі на Гомель, а на Брэст — і блізка няма. Калі нават сустрэчныя ДАІшнікі на пытанне, як лепей праехаць, каб не прапусціць патрэбны паварот, сарамліва адказваюць, што яны не мясцовыя, — тут міжволі разгубішся. Давялося распытваць сустрэчных вадзіцеляў, з якіх прыкладна кожны другі даваў-такі дакладныя ўказанні кшталту «адсюль налева, там усё проста і проста да скрыжавання, далей направа і на святлафоры зноў направа, а там убачыце». Дзякуй вялізны тым людзям, з дапамогай якіх мы ўсё ж не заблукалі паміж усімі аб'ездамі, мастамі і скрыжаваннямі. Але ўсё ж засмучае — чаму нават у XXI стагоддзі самай дакладнай мапай дарог аказваецца слоўнае апісанне?*

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.12.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 183,00 |
| 1 еўра | 2 815,20 |
| 1 латвійскі лат | 3 968,73 |
| 1 літоўскі літ | 815,39 |
| 1 чэшская крона | 109,64 |
| 1 польскі злоты | 727,45 |
| 1 расійскі рубель | 77,95 |
| 1 украінская грыўня | 233,43 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*
**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 28,0043 |
| 10 UAH | 36,0107 |
| 1000 BYR | 12,8401 |
| EUR | 37,0672 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.12.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2175 / 2250 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

«Еўрабачанне-2009»

# Стаўкі зробленыя, ставак больш няма

Падрыхтоўка да міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне», які налета пройдзе ў Маскве, у нашай краіне ўвайшла ў новую стадыю. Днямі прафесійнае журы агучыла імёны 15 выканаўцаў, адабраных для ўдзелу ў паўфінале нацыянальнага адбору — тэлевізійнага праект «ЕўраФэст». З іх ліку 15 снежня зноў жа рашэннем журы будуць абраныя фіналісты (максімум пяць чалавек), а ў студзені сваё важкае слова скажуць тэлегледачы, назваўшы два імені — асноўнага ўдзельніка «Еўрабачання» ад Беларусі і «запаснога» кандыдата, на ўсякі выпадак.

У паўфінале мы ўбачым і пачуем як добра знаёмых артыстаў (некаторых можна лічыць ужо ветэранамі «ЕўраФэсту»), так і амаль палову «новенькіх». Цалкам спіс выглядае наступным чынам:

1. Дамініка (бэк-вакалістка Тэатра песні Ірыны Дарафеевай, якая раней выступала пад сцэнічным імем Забава. Дарэчы, сама Ірына Дарафеева сёлета ў склад журы не ўвайшла — магчыма і з тых меркаванняў, каб асабістыя сімпатыі не паўплывалі на выбар канкурсантаў. Замяніла калегу ў судзейскай брыгадзе Іна Афанасьева). Выканае песню «My day».
2. Гурт «Вецер у галаве» (нягледзячы на тое, што гэта — іграki на полі «ЕўраФэсту» зусім новыя, журы, якое сёлета ўзначальвае Анатоль Ярмоленка, было ад выступлення калектыву ў захапленні). Спяюць «И — или — и».
3. Вікторыя Бялова (брэсцкая джазавая спявачка і актрыса) — «Don't give up from love».
4. Аляксей Крэчэт (удзельнік беларускага адбору на конкурс «Новая хваля-2008», уладальнік І прэміі міжнароднага эстраднага конкурсу «Залаты крыж-2008», які прайшоў на Мальце) — «Joy and freedom».
5. Дзядзя Ваня (Іван Вабішчэвіч, уладальнік спецпрыза Алы Пугачовай на «Новай хвалі-2008») — «Our Belarussia».
6. SingeRin (Кацярына Дудзіч) — «Don't think about it».
7. Гурт «Litesound» — «Miracle».
8. Дакота (Маргарыта Герасімовіч, фіналістка расійскага тэлепраекта «Фабрыка зорак-7») — «Цябе забываю».
9. Венера — «Big game».
10. Гюнеш — «Fantastic girl».
11. Гурт «Кола» і Лідзія Заблоцкая (яркія выразнікі нацыянальнага каларыту — беларуская мова ў сукупнасці з якаснай, «фарматнай» музыкай) — «Гудок».
12. Ганна Благава і Юрый Вашчук — «Позади».
13. Гурт «The Champions» — «Shake it Europe».
14. Аляксандр Патліс — «Кто сказал».
15. Пётр Елфімаў — «Eye, that never lie».

Пракаментаваць выбар прафесійнага журы мы папрасілі мастацкага кіраўніка тэлепраекта «ЕўраФэст» Аляксандра Ціхановіча. Паводле яго слоў, асноўнымі крытэрыямі суддзяў пры выбары былі — перш за ўсё песня, артыстычнае майстэрства і бездакорная інтанацыя артыстаў, а таксама пастаноўка нумара, хоць бы ў пачатковым варыянце. Усім паўфіналістам былі дадзены парады па дапрацоўцы конкурсных нумароў — камусьці параілі звярнуць увагу на бэк-вакал, камусьці прадумаць сцэнічнае рашэнне... «Безумоўна, выканальніцкі ўзровень гэтага года значна вышэйшы, чым быў раней, — мяркуе Аляксандр Ціхановіч. — Людзі пачалі разумець, што гэта за конкурс, падышлі да падрыхтоўкі сур'ёзна і адказна».

У 15, дарэчы, не аказалася некаторых папулярных артыстаў — так, адсеў не прайшлі Аляксандра Гайдук, Алена Грышанава, гурт «Топлес», Ганна Шаркунова, дуэт Вольга Плотнікава — Дзмітрый Врангель. У кулуарах кажуць — маўляў, не змаглі нічым здзівіць журы, у адрозненне ад больш удачлівых канкурэнтаў. Што пакідае спадзяванне пачуць усё ж на паўфінальным канцэрце, які адбудзецца 15 снежня ў прамым эфіры на Першым канале, нешта прынцыпова новае. І выбраць лепшае.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## На слыху

### НЕ ПАГУЛЯЛІ

У в. Вышэвічы Пінскага раёна супрацоўнікі міліцыі і дзяржкантролю выявілі нечаканую кантрабанду.

Зазірнулі да аднаго жыхара ў хату, а там — 26 гульнявых аўтаматаў без дакументаў.

Тавар на суму 50 мільёнаў рублёў канфіскаваны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### СЛЯДЫ БРАКАНЬЕРА ВЫВЕЛІ НА АРСЕНАЛ ЗБРОІ

Усё пачалося з сумеснага прыродаахоўнага рэйду, падчас якога работнікі Магілёўскай аблінспекцыі разам з супрацоўнікам Бялыніцкага лясгаса знайшлі тушу дзіка-сяголетка. На месца выклікалі следча-аператыўную групу Бялыніцкага РАУС.

Падчас праследавання па слядах парушальніка было знойдзена выкінутае ім паляўнічае ружжо ТОЗ-БМ. Калі сляды вывелі да дома непрацуючага грамадзяніна, супрацоўнікі міліцыі правялі вобыск. У выніку было знойдзена паляўнічае ружжо ІЖ-17, боепрыпасы да яго, самаробная малакаліберная вінтоўка з аптычным прыцэлам і боепрыпасамі, самаробны шротавы пісталет, патрон да пісталета ТТ, два патроны неўстаноўленай прыналежнасці да наразной зброі, траціілавая шашка. Уся канфіскаваная зброя была незарэгістраванай. Бялыніцкім РАУС узбуджана крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### НА ЧУЖЫМ НЕ РАЗБАГАЦЕЛІ

У мінулую нядзелю а палове дзявятай вечара на саракагадовую брастаўчанку каля парога дома па вуліцы Машэнскага напаў рабаўнік і выхапіў з рук сумачку, дзе былі дакументы і 600 тысяч рублёў. Але 24-гадовы нягоднік быў затрыманы нарадам аховы па гарачых слядах. А днём раней у Маларыце абрабавалі мужчыну на вуліцы Лермантава двое раней судзімых, сілай адабралі 200 тысяч рублёў і 1 тысячу долараў. Аднаго з рабаўнікоў ужо затрымалі, другога шукаюць праваахоўнікі.

**Кар. «Звязды».**

Вандруючы па мястэчках

# Купалава калыска

## Сёння — 439-годдзе самастойнасці Радашковічаў

Сучасныя Радашковічы — невялічкі гарадок у Маладзечанскім раёне з насельніцтвам блізу шасці тысяч чалавек. Раней жа гэта быў нават горад, што меў магдэбурскае права...

Мястэчка ўпершыню ўзгадваецца, паводле гістарычных архіваў, у 1447 годзе ў сувязі з будаваннем тут касцёла Св. Троіцы. Касцёл гэты, пабудаваны ў стылі класіцызму, месціцца і цяпер, бадай што, у цэнтры горада. Пазней у 1882 годзе тут быў хрышчоны будучы народны песняр Беларусі — Янка Купала. Але гэта пасля...

На пачатку ж гісторыі блізу Радашковічаў рассяліліся плямёны шнуравай керамікі — нядзіўна, што зараз тут знаходзіцца найвялікшы ў Беларусі завод па вырабе керамікі. Радашковічы заўжды былі пэўным памежкам паміж культурамі, плямёнамі, дзяржавамі...

Так, дзесьці да VI стагоддзя гэта была самая ўскраіна рассялення балцкіх плямёнаў. Пазней іхняе месца занялі крывічы. З Х стагоддзя гэтыя землі ўваходзілі ў склад Полацкага княства, былі ягоным памежжам. Па некаторых археалагічных звестках, якраз тады Радашковічы і ўзніклі ў зліцці рэк Вязынка і Гуйка ў Рыбчанку, услед за Маладзечнам і Лебедзевам. Назоў жа горада пайшоў ад слова «Рада» — нават і сёння мясцовыя жыхары менавіта так гэты горад і называюць, з націскам на першы склад. Каля Радашковічаў з 1248 года праходзіла пачатковая мяжа новай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага...

Даехаць да Радашковічаў можна даволі проста: дастаткова альбо праехаць 40 кіламетраў ад Мінска ў бок Вільнюса ці, калі вы жадаеце атрымаць пэўную долю рамантызму, правандраваць у электрычцы каля 30 хвілінак да станцыі Радашковічы, дзе вам прыйдзецца пачакаць пэўнага аўтобуса.

У гэтых мясцінах вас чакаюць вельмі прыгожыя краявіды: шматлікія пагоркі, рачулкі, хутарочкі — у дадатак сонечнае надвор'е, і, здаецца, болей нічога непатрэбна. Нездарма ж у гэтых мясцінах вырас малады Іван Луцэвіч! Насамрэч, калі праглядзець ягоную біяграфію, то можна заўважыць, што Радашковічы займалі далёка не апошняе месца ў жыцці будучага паэта. Так, калі памёр бацька і маладому Янку давялося ўскінуць усе сямейныя цяжкасці на свае плечы, у 1903 годзе ён уладкоўваецца тут на пасаду пісара ў судовага следчага Андруцкага. А ўжо праз дзесяць гадоў тутака Мінскім беларускім артыстычным гуртком была пастаўлена купалаўская «Паўлінка». І дзякуючы перапляценням лёсу, менавіта тут ён пазнаёміўся з рэдактарам і выдаўцом першай беларускай газеты «Наша ніва», які і прапанаваў Купалу стаць яе рэдактарам...

Цяпер Радашковічы афіцыйна завуцца пасёлкам гарадскога тыпу. Раней жа яны былі і вёскай, і горадам: павятовым, заштатным і цэнтрам воласці. Так, упершыню званне горада яны атрымалі ў 1549 годзе, а ўжо праз 20 гадоў і магдэбургскае права — права горада на самакіраванне. Воляй лёсу герб, сэнс якога яшчэ нават і сёння не цалкам зразумелы геральдыстам, з'явіўся ў Радашковічаў, як ні дзіўна, толькі ў 1792 годзе. І ўжо ў наш час, зацверджаны 17 лістапада 1999 года Маладзечанскім раённым Саветам дэпутатаў, герб атрымаў свой цяперашні выгляд: «У сярэбраным полі «барочнага», ці «германскага», шчыта паясная выява Святога Стэфана, закіданага камянямі». Гісторыя хрысціянства расказвае аб тым, што гэты святы пакутнік першага стагоддзя новай эры быў забіты за сваю палымяную прапаведзь. Падчас гэтага ён папрасіў: «Госпадзі! Ня ўміні ім граху сяго»...




Менавіта ў Радашковічах, пры дапамозе тамашняга ксяндза, у 1922 годзе Аляксандар Уласаў урачыста адчыніў дзверы беларускай гімназіі імя Францыска Скарыны, што, варта сказаць, ва ўмовах польскай акупацыі было амаль што немагчыма. Менавіта ў гэтай гімназіі навучаўся і будучы народны паэт Беларусі Яўген Скурко, больш вядомы пад псеўданімам Максім Танк. У гімназіі ставіліся п'есы, літаратурныя вечарыны, выдаваліся рукатворныя часопісы... У 1928 годзе яна была зачыненая польскімі ўладамі, як «радыкальная па нацыянальным пытанні».





Дык вось, калі прайсціся ад школы ўздоўж цэнтральнай вуліцы, як калісьці хадзіў знакаміты мастак Язэп Драздовіч, можна ўбачыць каталіцкія і яўрэйскія могілкі XIX ст., і ансамбль паўвекавой забудовы, і, безумоўна, амаль шасцісотгадовы касцёл. У самым канцы вуліцы, перайшоўшы цераз рачулку, напаткаеш помнік Герою Савецкага Саюза капітану Міколу Гастэлу, які падчас Вялікай Айчыннай вайны тут здзейсніў сваю гераічную атаку.

Сапраўды, уся гісторыя Радашковічаў ахутаная не толькі культурным мінулым, але і сапраўдным вайсковым. Так, яшчэ падчас Лівонскай вайны XVI ст. у павятовым гарадку адбылася сустрэча войскаў Жыгімонта II Аўгуста і Івана IV Жахлівага. Бітва, аднак, так і не адбылася: напужаны Іван не рашыўся пачынаць вайсковых дзеяў, а сам Жыгімонт так і не прыехаў да месца дыслакацыі беларускіх войскаў. Такім чынам, Радашковічы сталі «месцам змірэння» беларусаў і рускіх.

Пазней, падчас так званай «Невядомай Вайны», Радашковічы былі поўнасцю знішчаныя войскамі цара Аляксея Міхайлавіча. А ў 1708 годзе тут адбыліся перамовы між шведскім каралём Карлам XII і самаабвешчаным вялікім князем літоўскім Станіславам Ляшчынскім, які, паводле дамовы, абяцаў зрабіць ВКЛ воласцю Швецыі. Ляшчынскі, праўда, нядоўга ўтрымаўся ля ўлады, а шведы ў гэтым жа годзе прайгралі Палтаўскую бітву.

Было ў Радашковічах і рэвалюцыйнае мінулае...

Увогуле Радашковічы, гэта цудоўная мясціна, якая змяшчае ў сабе прыродную прыгажосць і чалавечую геніяльнасць, насычанасць гісторыі і супакоенасць філасофіі. Каго гэтая зямля толькі ні пабачыла: Я. Купала, М. Танк, Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, Ф. Стацкевіч, А. Уласаў, А. Гаштольд, Б. Сфорца, Глябовічы, Масальскія, Агінскія, Радзівілы!.. Пабываць у гэтым мястэчку варта!

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | | | Производственное республиканское унитарное предприятие «Промсвязь» УП «Промсвязь» Министерство связи и информатизации Республики Беларусь | Республиканское производственное унитарное предприятие «Белвторполимер» УП «Белвторполимер» Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Брестсортсемовощ» РУП «Брестсортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Производственное республиканское унитарное торфопредприятие «Браславское» УП «Браславское» Министерство энергетики Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Борисовский завод агрегатов» РУП «Борисовский завод агрегатов» Министерство промышленности Республики Беларусь | Комплектующее оптово-торговое республиканское унитарное предприятие «Стройкомплект» РУП «Стройкомплект» Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | | | 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 18 | 230003, г. Гродно, ул. Скидельское шоссе, 20 | 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Домашевичская, 8а | 211972, Витебская обл., Браславский р-н, д. Ахремовцы | 222517, Минская обл., г. Борисов, ул. Полка Нормандии-Неман, 1а | 220012, г. Минск, ул. Чернышевского, 10а |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | | | Производство аппаратуры связи, станций проводного вещания, платежных терминалов, телефонных аппаратов | Производство пластмассовых плит, полос, труб и профилей, прочих пластмассовых изделий; обработка неметаллических отходов и лома | Розничная и оптовая торговля семенами овощных, кормовых, цветочных культур, посадочными материалами | Производство торфяных брикетов. Топливные брикеты | Производство изделий общемашиностроительного применения, производство двигателей и турбин; турбокомпрессоры, пневмокомпрессоры, насосы масляные и водяные, фильтры масляные | Оптовая торговля |
| Положение на рынке | | | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | | | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | | | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | | | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 230023, г. Гродно, ул. 17 сентября, 39 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 |
| Численность работающих, чел. | | | 501 | 149 | 42 | 135 | 1700 | 30 |
| Сроки предъявления претензий | | | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | | | 28 455 688 800 | 12 653 581 600 | 555 680 400 | 4 125 946 000 | 39 418 060 332 | 2 398 734 003 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | | | 21 788 272 570 | 10 247 857 177 | 332 132 895 | 2 482 605 153 | 33 269 350 709 | 1 361 498 102 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | | | 6,8124 | 4,8072 | 4,3163 | 315,7 | Завод – 16,412 Филиал (СПК) – 2 841,0365 | нет |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | | | 56 667 180 | 478 940 | 2 200 000 | нет | 31 455 602 | 2 953 750 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, рублей | | | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей | Балансовая прибыль | | 268 497 068 | 698 306 572 | 23 885 311 | 108 021 424 | 5 214 032 742 | 230 370 416 |
| | Задолженность | кредиторская | 1 263 490 272 | 382 776 301 | 238 989 732 | 161 199 115 | 6 928 373 741 | 49 265 997 |
| | | дебиторская | 1 912 296 714 | 652 683 303 | 126 093 498 | 33 870 184 | 3 891 430 016 | 40 902 816 |

| Республиканское унитарное Могилевское автотранспортное предприятие «Облавтотранс» с 20 республиканскими унитарными дочерними автотранспортными предприятиями (Белыничский «Автомобильный парк № 7», Бобруйский «Автобусный парк № 2», Быховский «Автомобильный парк № 6», Глусский «Автомобильный парк № 15», Горецкий «Автомобильный парк № 17», Кировский «Автомобильный парк № 17», Климовичский «Автомобильный парк № 9», Кличевский «Автомобильный парк № 16», Костюковичский «Автомобильный парк № 8», Кричевский «Автобусный парк № 3», Круглянский «Автомобильный парк № 24», Могилевский «Автобусный парк № 1», Могилевский «Автобусный парк № 4», Мстиславский «Автомобильный парк № 12», Осиповичский «Автомобильный парк № 19», Славгородский «Автомобильный парк № 21», Хотимский «Автомобильный парк № 23», Чаусский «Автомобильный парк № 10», Чериковский «Автомобильный парк № 20», Шкловский «Автомобильный парк № 5») РУМАП «Облавтотранс» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Производственное республиканское унитарное предприятие «МИНСКИЙ МЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМ. С.И. ВАВИЛОВА» УП «ММЗ им. С.И. Вавилова» Министерство промышленности Республики Беларусь | Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «ИНСТИТУТ БЕЛНИИЛИТ» УП «ИНСТИТУТ БЕЛНИИЛИТ» Министерство промышленности Республики Беларусь | Производственное республиканское унитарное предприятие «Минский моторный завод» совместно с дочерним республиканским унитарным предприятием «Торговый дом моторного завода», г. Минск УП «ММЗ» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Грузовой автопарк № 5» РУП «Грузовой автопарк № 5» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Энергетическая стратегия» РУП «Энергетическая стратегия» Министерство энергетики Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|
| 212030, г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 1 | 220023, г. Минск, ул. Макаенка, 23 | 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 28 | 220070, г. Минск, ул. Ваупшасова, 4 | 220024, г. Минск, п/у Колядичи, ул. Бабушкина, 27 | 220029, г. Минск, ул. Киселева, 22 |
| Перевозки автобусами, деятельность автомобильного грузового транспорта | Производство оптической и оптико-механической продукции; производство частей и принадлежностей автомобилей и их двигателей | Разработка конструкторской и технологической документации; изготовление образцов технологического оборудования для получения литых заготовок из черных и цветных металлов | Производство дизельных двигателей внутреннего сгорания, запчастей к ним, алюминиевое литье | Грузоперевозки | Исследования и разработки в области естественных наук и инженерии |
| Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 |
| 3101 | 3 426 | 179 | 7921 | 158 | 12 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 49 110 001 600 | 135 369 335 200 | 4 513 792 800 | 281 376 353 286 | 8 024 102 991 | 188 104 400 |
| 100 383 000 000 | 92 982 721 174 | 2 759 118 060 | 199 929 471 276 | 9 244 025 125 | 85 215 182 |
| 82,7129 | 35,7499 | 4,3223 | 7690,51 | 9,7442 | нет |
| 207 000 000 | 1 451 635 514 | нет | 311 367 869 | нет | 5 400 000 |
| 13 000 000 | 2 641 420 | нет | 1 181 250 | нет | нет |
| 2 134 000 000 | 11 856 705 005 | 38 557 675 | 66 993 674 233 | -593 307 450 | 71 180 610 |
| 31 680 000 000 | 13 168 846 252 | 4 899 448 051 | 59 759 000 000 | 386 229 697 | 62 621 128 |
| 4 965 000 000 | 14 765 840 471 | 770 547 917 | 40 373 000 000 | 362 245 125 | 263 473 |

Чытачы ўзнімаюць праблему

# «Няўжо нам непатрэбная «Сусветная і айчынная мастацкая культура»?»

**У рэдакцыю «Звязды» паступаюць тэлефанаванні і лісты адносна новай школьнай праграмы. Найбольш пытанняў выклікала ліквідацыя прадмета «Сусветная і айчынная мастацкая культура». Многія цікавяцца: хіба правамоцна замяняць гэты надзвычай важны прадмет чарчэннем, якое ўведзена ў школьны расклад з гэтага навучальнага года?**

**Аргументы вучняў — у наступных лістах.**

## Каму перашкаджала СМК?

Рашэнне зняць прадмет са школьнай праграмы — даволі неасцярожны крок. Бо гаворка ідзе аб духоўным развіцці асобы. Сама назва прадмета, калі расшыфраваць яе цалкам, гучыць так: «Сусветная і айчынная мастацкая культура». У першую чаргу, айчынная: культура нашай краіны, нашага народа. Гэта нашы карані і наша гісторыя. Мігель дэ Сервантэс сказаў: «Гісторыя — скарбніца нашых дзеянняў, сведка мінулага, прыклад і павучанне для сучаснага, перасцярога для будучага». Менавіта гісторыя і культура кожнага народа робіць яго ўнікальным, непаўторным. Толькі ведаючы мінулае сваёй краіны, яе жыхар можа па праву лічыць сябе часцінкай нацыі.

Самая важная рыса СМК заключаецца ў тым, што гэты прадмет пашырае кругагляд вучня, дапамагае лепш арыентавацца ў культуры розных краін. Гэта ўплывае на ўзровень эрудыцыі і агульную дасведчанасць. На ўроках СМК дзецям даюцца тыя азы, якія павінен ведаць кожны больш ці менш развіты чалавек. Урокі СМК таксама маглі паўплываць на фарміраванне ўласнага светапогляду вучня. На іх ён вучыцца адчуваць, мысліць.

Хтосьці скажа: «Няхай культуру вывучаюць тыя людзі, якім гэта цікава». Кожны вырашае для сябе. Але ж мы сутыкаемся з тымі ці іншымі пластамі культуры паўсюдна: гэта і архітэктурныя стылі, і віды жывапісу, і жанры літаратурных твораў; гэта музыка, тэатр і кіно. Усё ж больш прыемна, калі ведаеш, дзе ўзнікла тая ці іншая плынь, хто быў яе прадстаўніком і ці ёсць у тваім родным горадзе будынкі ў стылі, напрыклад, барока.

Жыццё кароткае, а мастацтва вечнае. І каб не страціць творчую працу, якая ствaралася тысячагоддзямі, трэба яе ведаць, любіць і берагчы.

**Кацярына АЛЯКСАНДРАВА, вучаніца 11 класа гімназіі № 1 г. Мінска.**

У кожнага вучня ёсць свой любімы прадмет. Прадмет, які мяне ўразіў, — СМК (сусветная мастацкая культура). У нас выкладала цудоўная настаўніца — Немзер Дора Ізраілеўна, вельмі адукаваны і працавіты чалавек. Стылем яе выкладання мастацтва і ўсяго таго, што з ім звязана, захапляліся амаль усе вучні. Яна цудоўна ведала ўсё тое, што даносіла да нас. Наша настаўніца паспрабавала ўзрасціць кветку любові да Вялікага мастацтва, культуры, кветку веры ў сябе. Гэта былі не сухія ўрокі, яны вылучаліся з шэрагу звычайных школьных дзён вельмі яркімі колерамі. У маім класе вучні гавораць аб уроках СМК так: «Цікавая інфармацыя для развіцця і вывучэння; на кожным уроку мы даведваліся аб нечым новым і былі зацікаўленыя гэтым; было цікава паслухаць пра жыццё людзей, якія жылі ў іншых стагоддзях, вельмі далёкіх ад нашага».

У гэтым годзе СМК вырашылі выкрасліць са школьнай адукацыйнай праграмы. Чаму так адбылося? На мой погляд, культуру павінен вывучаць і ведаць кожны з нас. Культура дапамагае чалавеку ўзняцца на больш высокі ўзровень развіцця.

Мы жадаем, каб у школах, гімназіях і ліцэях зноў вывучалі гэты важны і цікавы прадмет — сусветную мастацкую культуру!

**Крысціна БАЛАБОЛАВА, вучаніца 11 класа гімназіі № 174 г. Мінска.**

* * *

А вось яшчэ меркаванні школьнікаў.

**Марына ХАНЕЦКАЯ, 11-класніца СШ № 90 г. Мінска:**

— СМК павышае агульную адукаванасць, пашырае кругагляд вучняў. Мы не толькі даведаліся шмат новага аб свеце — мы адкрывалі новае ў сабе, развіваліся як асобы.

**Ганна ХАДАРОВІЧ, 9-класніца СШ № 186 г. Мінска:**

— Лічу, што адмена курса СМК — гэта памылка. Для мяне гэтыя ўрокі заўсёды былі святам.

**Вікторыя КУРЫЛІНА, СШ № 210:**

— СМК — гэта ўрокі выхавання чалавечай душы. Я вучуся ў 11 класе. Мне пашчасціла, што я паспела прайсці поўны курс гэтага прадмета.

**Вікторыя ШАКОЛІНА, гімназія № 1 г. Мінска:**

— Дзякуючы настаўніцы Чарнышовай Маргарыце Пятроўне я маю ўяўленне аб гісторыі культуры, магу разважліва ацэньваць сучасныя творы мастацтва, параўноўваць іх з класікай. Урокі СМК дапамаглі сфарміраваць уласны стыль і густ... Нельга пазбаўляць школьнікаў гэтага цудоўнага прадмета! Мне балюча думаць, што мая маленькая сястрычка, якая ў наступным годзе пойдзе ў школу, не атрымае ўрокаў СМК. Не варта ставіць крыж на гэтым прадмеце!

**Соф'я ЕРМАЛОВІЧ, гімназія № 8 г. Мінска:**

— Няўжо нельга вярнуць СМК? Памылкі рабіліся заўсёды, але — трэба своечасова іх выпраўляць!

**Вікторыя САЦУТА, гімназія № 15 г. Мінска:**

— Вельмі шкада, што курс СМК выключылі са школьнай праграмы. Гэты прадмет у пэўным сэнсе змяніў маё жыццё... Мне крыўдна за дзяцей, якія не сутыкнуцца з гэтым прадметам.

* * *

**Па каментарый да ўзнятага пытання мы звярнуліся ў Міністэрства адукацыі Беларусі.**

### У МІНІСТЭРСТВЕ АДУКАЦЫІ РАЗГЛЕДЖАНЫ ЗВАРОТ З УСТАНОВЫ «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА». ПАВЕДАМЛЯЕМ НАСТУПНАЕ.

*У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі» Міністэрствам адукацыі распрацаваны вучэбныя планы для ўсіх тыпаў агульнаадукацыйных устаноў, у якіх прыведзены ў раўнавагу змест вывучэння вучэбных прадметаў прыродазнаўча-матэматычнага і гуманітарнага цыклаў. Пытанні айчыннай і сусветнай мастацкай культуры ўлічаны пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі», «Руская літаратура», «Беларуская літаратура», «Музыка», «Выяўленчае мастацтва». Акрамя гэтага, на факультатыўных занятках па жаданні вучняў і іх законных прадстаўнікоў можна вывучаць вучэбны прадмет «Айчынная і сусветная мастацкая культура».*

*Для пашырэння ведаў вучняў у адукацыйнай галіне «Мастацтва» Міністэрствам адукацыі зацверджаны больш як 60 праграм факультатыўных заняткаў, якія размешчаны на сайце навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» (www.adu.by).*

*Нагадваем таксама, што ва ўстановах пазашкольнага выхавання і навучання рэспублікі вучні могуць наведваць аб'яднанні па інтарэсах з мэтай вывучэння розных відаў нацыянальнага і замежнага мастацтваў.*

**К.С. Фарыно, намеснік міністра.**

# НЯДБАЙНАСЦЬ І ЯК З ЁЙ ЗМАГАЦЦА

## НЯДБАЙНЫЯ БАЦЬКІ КАМПЕНСУЮЦЬ ДЗЯРЖАВЕ ЎСЯГО ТРЭЦЬ ЗАТРАТ НА ЎТРЫМАННЕ ІХ ДЗЯЦЕЙ

Аб тым, як складваецца сітуацыя ў гэтай галіне, карэспандэнт БЕЛТА гутарыць з **начальнікам аддзела па справах няпоўнагадовых і моладзі Генпракуратуры Беларусі Валерыем ІВАНОВЫМ.**

— Можна гаварыць, што многія статыстычныя паказчыкі па выкананні патрабаванняў дэкрэта № 18 палепшаны, большая колькасць дзяцей, адабраных раней у бацькоў па рашэнні камісій па справах няпоўнагадовых, вернуты ў сем'і. За дзевяць месяцаў гэтага года такіх дзяцей вернута больш як 3,4 тыс. Акрамя таго, 660 дзяцей па рашэнні суда вернуты бацькам, раней пазбаўленых бацькоўскіх правоў.

Я лічу, што існуючая статыстыка не зусім правільна адлюстроўвае стан спраў. Патрэбна адзіная дзяржаўная статыстыка. Глядзіце самі: па даных Мінюста, на сёння на ўліку крыху больш як 28 тыс. асобаў, абавязаных кампенсаваць расходы на ўтрыманне сваіх дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні; паводле даных Мінпрацы і сацабароны, больш як 14 тыс. гэтых асобаў працаўладкаваны; паводле даных МУС, каля 3 тыс. абавязаных асобаў знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі і лячэбна-працоўных прафілакторыях (ЛПП). Гэта значыць, мяркуючы па гэтых лічбах, больш як 50 працэнтаў урону павінна кампенсавацца. Тым не менш на сёння кампенсавана ўсяго толькі трэць ад агульнай сумы каля Br110 млрд.

***— Ці можаце вы назваць якія-небудзь новыя метады, якія садзейнічаюць забеспячэнню большага працэнта кампенсацыі затрат?***

— На нядаўна праведзенай калегіі генпракурор прапанаваў распрацаваць сістэму прыцягнення абавязаных асобаў да зносу дамоў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане.

***— Можа быць, у такіх нядбайных бацькоў трэба забіраць кватэры, перасяляць іх у горшыя ўмовы, а грошы ад здачы жылля ў наём накіроўваць на пагашэнне доўгу?***

— Так, заканадаўства прадугледжвае такую меру ўздзеяння і такі спосаб спагнання доўгу. Аднак, па-першае, жыллёва-камунальныя службы недастаткова актыўна праводзяць работу па выяўленні такіх асобаў, якія маюць хоць якую-небудзь нерухомую маёмасць. Па-другое, асноўная цяжкасць у тым, што ў такіх кватэрах часта не толькі жыць страшна, але нават уваходзіць туды. Калі рамонт будзе рабіць дзяржава, то гэта зноў жа вялікія затраты. Цяпер па рэспубліцы здаецца ўсяго 19 такіх кватэр.

***— Не так даўно паведамлялася, што плануецца стварыць некалькі прадпрыемстваў, куды будуць масава працаўладкоўваць усіх нядбайных бацькоў...***

— У мяне ёсць інфармацыя, што работа ў гэтым напрамку праводзіцца. Гэта няпростае пытанне. Трэба ствараць новае жыллё, новую вытворчую базу, траціць даволі значныя сродкі. Акрамя таго, неабходны затраты на прафесійнае навучанне гэтых людзей, якія часта нічога не ўмеюць рабіць, у іх няма ніякай матывацыі да працы. Што датычыцца іх кампактнага прыцягнення да працы, то, на маю думку, гэта добры метад, і ён можа даць станоўчы эфект. Проста трэба падумаць, як гэта лепш арганізаваць.

Размова можа ісці аб прадпрыемствах накшталт ЛПП. У Беларусі цяпер дзейнічаюць чатыры ЛПП, тры з якіх для мужчын. У іх утрымліваюцца ў тым ліку і абавязаныя асобы — яны працуюць і кампенсуюць урон.

***— Часта кіраўнікі прадпрыемстваў проста не хочуць браць гэту катэгорыю людзей на работу, бо яны дэстабілізуюць сітуацыю ў калектыве. Якія вы бачыце шляхі вырашэння гэтай праблемы?***

— Пасля таго як мы нядаўна правялі праверкі ў гэтым напрамку, была падрыхтавана інфармацыя для Саўміна Беларусі. У якасці вырашэння праблемы прапанавана ствараць на прадпрыемствах кампактныя брыгады, каб яны працавалі асобна пад наглядам супрацоўніка міліцыі. Такая практыка ў некаторых арганізацыях прымяняецца ўжо. У рэшце рэшт, сутнасць дэкрэта не толькі ў тым, каб кампенсаваць расходы, але і ў тым, каб вярнуць абавязаных асобаў да нармальнага чалавечага жыцця, устараніць сямейнае няшчасце.

***— Генпракуратура 3 снежня наведала адно з прадпрыемстваў Мінска, дзе лічацца працаўладкаванымі 10 абавязаных асобаў. Што паказалі вынікі праверкі?***

— Тэзіс аб тым, што многія проста лічацца там як «мёртвыя душы», на жаль, пацвердзіўся. З 10 абавязаных асобаў трое былі звольнены ў сувязі з тым, што ўступілі ў законную сілу прыгаворы судоў, двое знаходзяцца ў вышуку за ўхіленне ад работы. Яны або змянілі месца жыхарства, або проста хаваюцца, і міліцыя не можа іх знайсці. Трое працуюць, з іх двое больш-менш пастаянна, але і яны робяць прагулы.

***— Як жа трэба вырашаць гэту праблему?***

— Найперш неабходны кантроль. Трэба, каб прадпрыемствы, дзе працуюць абавязаныя асобы, рэгулярна наведвалі прадстаўнікі выканкамаў, камісій па справах няпоўнагадовых. Міліцыя дык увогуле проста адмахваецца, як ад надакучлівых мух, хоць у дэкрэце дакладна прапісана, хто і што павінен кантраляваць. Гэта значыць атрымліваецца, што ўсе пакідаюць дырэктара канкрэтнага прадпрыемства сам-насам з бядой. У яго самога няма ніякіх правоў у адносінах да гэтых абавязаных асобаў, няма нават права іх звольніць. Караць такіх людзей няма сэнсу, на іх хоць сто вымоў вешай, а ім хоць бы што. Калі кіраўнікі звяртаюцца па дапамогу, то ім або не адказваюць, або адказваюць і прысылаюць адпіскі. Вось у тым галоўная бяда — у адсутнасці каардынацыі і ўзаемасувязі. Няма нават простага абмену інфармацыяй.

**Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.**



Фота Пятра ФАМІНА.

## Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское унитарное предприятие «Брестская областная контора пчеловодства» РУП «Брестская облпчелконтора» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «ЛЭМТ» УП «ЛЭМТ» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Объединенная дирекция строящихся объектов» РУП «Объединенная дирекция строящихся объектов» Министерство культуры Республики Беларусь | Торговое республиканское унитарное предприятие «Текстильторг» УП «Текстильторг» Белорусский государственный концерн по производству и реализации товаров легкой промышленности | Производственное республиканское унитарное торфопредприятие «УСЯЖ» ПРУТП «УСЯЖ» Министерство энергетики Республики Беларусь | Республиканское производственное унитарное предприятие «Клецкий мехзавод» Государственное предприятие «Клецкий мехзавод» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское торгово-закупочное унитарное предприятие «Витебсксортсемовощ» РУП «Витебсксортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 224012, г. Брест, ул. Калинина, 65 | 220023, г. Минск, ул. Макаенка, 23, корп. 1 | 220089, г. Минск, ул. Шатько, 24 | 220005, г. Минск, ул. Платонова, 32 | 222212, Минская обл., Смолевичский р-н, п. Усяж, ул. Промышленная, 16 | 222640, Минская обл., г. Клецк, ул. Победы, 46 | 210034, г. Витебск, ул. Транспортная, 9 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Обеспечение пасек и пчеловодов любителей материалом и оборудованием, необходимым для опыления; опыление энтомофильных культур | Производство оптических и оптико-механических приборов: лазерные целеуказатели, прицелы, лазерные дальномеры, медицинская техника | Технический надзор в строительстве | Оптовая и розничная торговля товарами легкой промышленности | Производство торфяных брикетов | Производство сельхозмашин | Оптовая и розничная торговля семенами овощных культур, кормовых корнеплодов, лука-севка, ядохимикатами и удобрениями |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 |
| Численность работающих, чел. | 22 | 187 | 33 | 46 | 273 | 314 | 33 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 579 480 400 | 3 541 753 600 | 222 032 800 | 378 866 400 | 14 049 239 600 | 4 264 136 800 | 1 655 349 961 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 626 508 126 | 1 684 002 073 | 284 199 058 | 475 345 489 | 10 763 525 275 | 3 598 826 155 | 1 383 734 199 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 0,4468 | 0,0286 | 0,41 | 0,5090 | 40,4992 | 3,5371 | 1,4077 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, рублей | нет | 100 866 138 | нет | нет | 93 627 118 | 698 672 | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 35 448 400 | 1 050 921 687 | 182 749 337 | 117 000 000 | 482 856 030 | 359 084 773 | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность кредиторская | 27 763 393 | 4 964 482 036 | нет | 797 000 000 | 383 688 912 | 639 158 061 | 94 355 318 |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность дебиторская | 46 543 823 | 1 246 092 208 | 17 000 000 | 389 000 000 | 1 072 122 334 | 696 326 827 | 53 000 000 |

| Производственное республиканское унитарное предприятие «Стройтехпрогресс» РУП «Стройтехпрогресс» Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь | Конструкторское республиканское унитарное предприятие «Оптоэлектронные системы» с 3-я дочерними республиканскими унитарными предприятиями («ОКБ Спецтехмаш», г. Минск, «Компас», г. Минск, «Спектрокомплекс», г. Витебск) УП «Оптоэлектронные системы» Министерство промышленности Республики Беларусь | Проектно-технологическое республиканское унитарное предприятие «Сельхозтехпроект» РУП «Сельхозтехпроект» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Белорусское морское пароходство» РУП «Белорусское морское пароходство» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Проектно-конструкторское республиканское унитарное предприятие «Оргтехстром» РУП «Оргтехстром» Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Гомельсортсемовощ» РУП «Гомельсортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское производственное унитарное предприятие «Завод «Измеритель» РПУП «Завод «Измеритель» Министерство промышленности Республики Беларусь | Гродненское республиканское унитарное производственное предприятие «Радиоволна» Государственное предприятие «Радиоволна» Министерство промышленности Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 21 | 220049, г. Минск, ул. Черняховского, 1 | 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 | 220006, г. Минск, ул. Денисовская, 9 | 220114, г. Минск, ул. Я. Мавра, 49а | 246027, г. Гомель, ул. Барыкина, 155 | 211440, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, 166 | 230015, г. Гродно, ул. Горького, 89 |
| Изготовление технологического оборудования для производства строительных материалов | Производство оптических приборов, электрораспределительной и регулирующей аппаратуры | Разработка всех разделов проектной документации для строительства или реконструкции зданий и сооружений, авторский надзор за строительством | Услуги транспортно-экспедиционной деятельности, сдача имущества в аренду | Деятельность в области архитектуры, инженерная и техническая деятельность, разработка проектно-сметной документации | Оптовая и розничная торговля сельскохозяйственной продукцией | Производство средств измерений и контрольно-измерительных приборов | Производство электрооборудования для двигателей и транспортных средств, производство кондиционеров воздуха, вентиляторов, производство замков и петель, литье прочих цветных металлов |
| Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| 77 | 39 | 66 | 25 | 46 | 50 | 911 | 1897 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 6 500 000 000 | 1 253 200 000 | 376 415 600 | 3 346 449 278 | 1 487 028 385 | 2 255 426 800 | 26 599 338 | 58 305 161 200 |
| 6 184 765 698 | 911 563 400 | 124 457 805 | 3 260 137 472 | 1 240 711 757 | 2 125 431 271 | 30 965 460 | 60 642 651 170 |
| 3,1334 | 0,4544 | нет | 4,9 | 0,8926 | 0,3938 | 25,7 | 17,1842 |
| нет | нет | нет | 1 658 496 | нет | нет | 1 068 | 15 242 145 |
| нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| 18 614 088 | 143 105 230 | 142 929 427 | -288 532 820 | 259 271 974 | 5 973 278 | 504 172 | 2 932 372 071 |
| 180 104 315 | 433 120 000 | 724 013 126 | 1 419 956 299 | 571 667 903 | 502 185 504 | 4 090 922 | 4 095 902 379 |
| 2 720 245 429 | 233 950 000 | 403 957 627 | 919 041 587 | 94 806 873 | 372 855 593 | 612 403 | 1 725 786 520 |

Альтэрнатыўныя ад А да Я

# ЦЯПЛОМ ЗЯМЛЯ ПОЎНІЦЦА

## Здабыча энергіі з нетраў сёння адна з самых перспектыўных



У мінулы раз мы з вамі «дасягнулі» сонца, а зараз «спусцімся» на зямлю, дакладней — у зямлю. Адтуль, з глыбіняў, таксама можна чэрпаць цяпло. Больш за тое, гэта сёння ледзь не самы перспектыўны від энергетыкі ў Германіі. Яно і зразумела: геатэрмія (у перакладзе з грэчаскага — цяпло зямлі) не залежыць ад кліматычных умоў, сезонаў і часу сутак, не чыніць шкоды навакольнаму асяроддзю, можа быць выкарыстаная і для ацяплення, і для выпрацоўкі электраэнергіі. У адрозненне, скажам, ад сонечных калектараў (прадуктыўнасць якіх залежыць ад надвор'я) і ветракоў (яны выпрацоўваюць толькі электрычнасць). Аднак і на зямлі «ёсць плямы»: цяпло адтуль яшчэ трэба «дастаць», а свідраванне — зусім нятаннае. Тым не менш, геатэрмія можа быць для нас цікавай. Ужо хоць бы таму, што краіна наша не самая спякотная і хуткасці вятроў у нас даволі сціплыя. Вось мы і вырашылі азнаёміцца з нямецкім досведам геатэрміі. А нашым гідам па «зямных нетрах» будзе спецыяліст Геатэрмічнага цэнтра Бохума Штэфан Экснэр.

Даследчы цэнтр яднае тэарэтыкаў і практыкаў: універсітэты і прадпрыемствы працуюць у звязцы, развіваючы сферу геатэрміі. І ўзнік ён менавіта на гэтай тэрыторыі (у мінулым буйны індустрыяльны раён) невыпадкова: «Было вырашана, што менавіта ў гэтай частцы краіны, дзе раней здабывалі вугаль, ёсць спецыялісты, якія лепш за ўсё ведаюць, што знаходзіцца ў зямлі», — адзначае Штэфан Экснэр. Так вопыт, набыты ў сферы традыцыйных крыніц, ставіцца на службу альтэрнатыўнай энергетыцы. Асноўныя кірункі дзейнасці цэнтра — прыкладныя даследаванні, падрыхтоўка спецыялістаў і інфармацыйная работа. «Мы паказваем сябе на выставах, інфармуем грамадзян і прадпрыемствы аб сваёй дзейнасці», — дадае суразмоўца.

— Існуе два віды геатэрміі — паверхневая (на глыбіні прыблізна 400 метраў) і глыбінная (4 — 5 тысяч метраў), — кажа навукоўца. — У Ісландыі, напрыклад, ужо на глыбіні літаральна некалькіх метраў — гарачая вада. А вось Германія — не вельмі прыдатная для паверхневай геатэрміі краіна. Тут можна ацяпляць такім чынам толькі невялікую частку будынкаў. На глыбіні 100 метраў — тэмпература прыкладна 13 — 14 градусаў, на глыбіні 400 метраў — 20 — 25 градусаў. Гэтага недастаткова, каб ацяпляць дом зімой. Таму выкарыстоўваюцца цеплавыя помпы, якія працуюць ад электрычнасці і падаграваюць ваду да неабходнай тэмпературы (у замкнёнай сістэме, па якой цыркулюе вада, таксама ёсць цеплаабменнік). І можна сказаць, што 75 працэнтаў такой энергіі атрымана за кошт геатэрміі, а 25 працэнтаў — з разеткі.

Пры глыбіннай геатэрміі ідзе нагрэў да 200 — 250 градусаў. Гэта можа быць выкарыстана і для прамога паступлення ў ацяпляльную сістэму, і для выпрацоўкі электраэнергіі. «Парам можна забяспечваць энергетычныя станцыі. Гэта адна магчымасць, а другая — калі ў зямлі не тэрмальныя воды, а камяні з расколінамі», — адзначае Штэфан Экснэр.

У такім выпадку робіцца свідравіна, куды пад вялікім ціскам запускаецца вада. Яна працякае праз шчыліны ў камянях, ад чаго тыя трашчаць. Дзякуючы сейсмографам (геафонам), якія ўлоўліваюць гукавыя хвалі, вызначаюць, дзе больш за ўсё расколваюцца камяні, і там свідруюць другую адтуліну. Праз яе вада, што прайшла скрозь камяні і нагрэлася, падымаецца на паверхню. І вось гэтую вадкасць ужо можна выкарыстоўваць для ацяплення дома або для работы электрастанцыі.

> «Дзясятая частка новабудоўляў у Германіі ацяпляецца энергіяй зямлі.»

— Гэты метад стаў прымяняцца ў Германіі зусім нядаўна, — заўважае навукоўца. — Чаму раней ім не карысталіся? Таму што гэта вельмі дорага. Прасвідраваць адну адтуліну можа каштаваць мільёны еўра. Нельга забывацца і на рызыку — можна натрапіць на вельмі цвёрдыя пароды і не здолець прабурыць свідравіну, можна разлічваць на тэмпературу 250 градусаў, а атрымаць менш...

Аднак ад такіх рызык у Германіі страхуюць:

— Да 2003 года тут заахвочваліся пераважна сонечная і ветраная энергія, а пасля сталі падтрымліваць і геатэрмію. Якім чынам? Па-першае, можна застрахавацца супраць цяжкасцяў пры свідраванні. Па-другое, дзяржава дае гарантыю, што наступныя 20 гадоў вытворцы змогуць прадаваць сваю энергію, атрыманую за кошт геатэрміі, па 15 еўрацэнтаў за кілават/гадзіну. Ім ёсць на што разлічваць. Дзяржава дапамагае і пры выкарыстанні паверхневай геатэрміі. Калі нехта збіраецца пабудаваць дом і заяўляе аб сваім жаданні выкарыстоўваць цяпло зямлі, ён атрымлівае грашовую дапамогу. Цеплавая помпа, скажам, даражэйшая за газавы кацёл, ды і прабурыць свідравіны грошай каштуе. Таму дзяржава падтрымлівае тых, хто хоча карыстацца экалагічна чыстай энергіяй.

Новаўвядзенні аказаліся плённымі — геатэрмія стала імкліва развівацца. Асабліва на поўдні Германіі, дзе землі для гэтага больш прыдатныя. Паводле слоў спадара Экснэра, каля 10 працэнтаў новабудоўляў (у Паўночным Рэйне-Вестфаліі ды і па ўсёй краіне) выкарыстоўваюць геатэрмію, у сярэднім такая сістэма ацяплення для дома каштуе 12 — 15 тысяч еўра. На яго думку, укладзеныя грошы вернуцца гадоў праз восем — дзесяць.

Геатэрмія — гэта той від энергетыкі, які сёння «прырастае» хутчэй за ўсе астатнія. Аднак жыллё самога Штэфана Экснэра такім чынам не ацяпляецца: «Я жыву ў старым доме, там проста няма магчымасцяў. А вось кіраўнік Цэнтра геатэрміі Рольф Браке геатэрмію ў сваім доме выкарыстоўвае». У краіне функцыянуюць пакуль толькі тры геатэрмічныя электрастанцыі, але будуецца мноства новых... Пытанне толькі ў дарагавізне і патэнцыйных цяжкасцях пры бурэнні. Аднак над вырашэннем гэтых праблем сёння рупліва працуюць у Цэнтры геатэрміі. Як падкрэсліў Штэфан Экснэр, «вельмі важна даследаваць новыя тэхналогіі бурэння, каб гэта было больш танна і проста. Вынаходзіць нейкія новыя прыборы, спосабы даследавання зямлі, каб можна было дакладна высветліць прыдатнасць мясцовасці для геатэрміі». І вырашэнне гэтых праблем — справа выключна вартая: паводле слоў спадара Экснэра, патэнцыйна «зямных запасаў» хопіць на тое, каб цалкам забяспечыць патрэбы Германіі ў энергіі.

Што ж, нашы энергетычныя вышукі працягваюцца. Наступным разам мы з вамі прасочым усе тэхналагічныя этапы таго, як драўніна ператвараецца ў газ.

**Ала МАЧАЛАВА.**

*Бохум.*

### Цэнтр геатэрміі ў Бохуме

*Сюды звяртаюцца дзяржаўныя структуры і прыватнікі, якія вырашылі выкарыстоўваць геатэрмію. Даследчы цэнтр па іх замове «разведвае» тэрыторыю, вызначае яе прыдатнасць для атрымання цяпла зямлі. Зараз, напрыклад, спецыялісты цэнтра вывучаюць, ці мэтазгодна карыстацца геатэрміяй для дзяржаўных будынкаў у горадзе Эсэне. А таксама даследуюць пляцоўку, абраную фірмай для пабудовы электрастанцыі на базе геатэрміі. Цэнтр таксама акумулюе ўсю інфармацыю па геатэрміі ў Рурскай вобласці. Наладжваюцца кантакты з усімі прадпрыемствамі ў гэтай сферы — тымі, што выпускаюць абсталяванне для свідравання, займаюцца бурэннем, усталёўваюць спецыяльныя батарэі ў дамах і гэтак далей (такіх прадпрыемстваў у вобласці некалькі сотняў). «Мы прапанавалі іх увазе анкеты — цікавімся, якой яны бачаць у будучыні геатэрмію, колькі ў іх супрацоўнікаў, ці плануюць яны папоўніць штат у найбліжэйшы час, якія ў іх паказчыкі вытворчасці і гэтак далей», — расказаў Штэфан Экснэр. Ёсць і міжнародныя кантакты — з Аўстраліяй, Чылі, Канарскімі астравамі, Мексікай, ЗША, Паўднёвай Карэяй, Грэцыяй, Турцыяй і Расіяй. «Мы адкрытыя для кантактаў. У будучыні не выключана і супрацоўніцтва з Беларуссю», — запэўніў суразмоўца.*

## Аб'яўлены конкурс журналісцкіх работ аб прымяненні энергаэфектыўных тэхналогій

Як паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі Валерый Карашкоў, конкурс праводзіцца для прыцягнення ўвагі перыядычных друкаваных выданняў і электронных СМІ да пытанняў прымянення энергаэфектыўных тэхналогій у розных галінах народнай гаспадаркі Беларусі, інфармавання грамадскасці аб выніках укаранення інавацыйных падыходаў у энергетыцы.

На конкурс прымаюцца матэрыялы, апублікаваныя ў перыяд з 1 студзеня 2008 года па 31 сакавіка 2009 года. Заяўкі на ўдзел прымаюцца да 15 красавіка 2009 года па адрасу: ДУ «Нацыянальны прэс-цэнтр Беларусі», 220030, Мінск, вуліца Кастрычніцкая, 5. Вынікі конкурсу будуць падводзіцца ў маі наступнага года.

Арганізатарамі конкурсу выступаюць Нацыянальны прэс-цэнтр, Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, будаўнічы холдынг «Сармат» пры падтрымцы Міністэрства энергетыкі Беларусі.

**БЕЛТА.**

## «Хачу расказаць: Беларусь — прыгожая краіна»

**Заўсёды прыемна чуць, калі аб тваёй радзіме добра адгукаюцца госці з іншых краін. Нядаўна мне выпала магчымасць прысутнічаць на семінары, у якім браў удзел Ар'ян Петэрсан — старшы выкладчык вышэйшай школы журналістыкі з г. Кальмар (Швецыя).**

Ён расказаў шмат цікавага пра друкаваныя і электронныя СМІ сваёй краіны, адказаў на пытанні прадстаўнікоў рэгіянальных СМІ нашай рэспублікі.

А напрыканцы сустрэчы ў Ар'яна Петэрсана запыталіся, што ён раскажа пра Беларусь на сваёй радзіме. Усміхнуўшыся і крыху падумаўшы, ён адказаў:

— У першую чаргу, пакажу здымкі, якія я зрабіў. Большасць тых, хто жыве ў Швецыі, лічыць, што Беларусь — шэрая краіна. Такі стэрэатып застаўся з часоў былога Савецкага Саюза. Але гэта не так. Гэта прыгожая краіна, а быў я ў многіх дзяржавах і магу параўноўваць. Мінск, думаю, у хуткай будучыні стане турыстычным магнітам.

Я сустракаўся з многімі маладымі людзьмі і прыйшоў да высновы, што ў іх такія ж, як і у нашай моладзі, думкі, мары, навыкі.

Падзялюся таксама тым, што Швецыя дзесьці на гадоў 10 апярэдзіла Беларусь па лічбавых тэхналогіях. У вас такая ж тэхніка, але нашмат даражэйшая, чым у маёй краіне.

У вас частка СМІ кантралююцца дзяржавай, а ў нас крыху іншая сістэма.

Раскажу аб тым, праз якія нягоды давялося прайсці вашаму народу.

Мне вельмі спадабаліся беларусы, гэта гасцінны народ. Асаблівай розніцы паміж намі няма. Мы і ежу ядзім аднолькавую, праўда, знакамітых калдуноў у нас не гатуюць, а бульбяныя бліны — так, толькі ядзім мы іх не са смятанай, а з ягадамі.

Я ўжо другі раз прыязджаю ў Беларусь і мару прыехаць яшчэ, каб убачыць усю краіну.

**Святлана ЛІПСКАЯ.**

## Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Проектное республиканское унитарное предприятие «Проектреставрация» УП «Проектреставрация» Министерство культуры Республики Беларусь | Республиканское дочернее производственное унитарное предприятие «Свитязь» РДПУП «Свитязь» Министерство промышленности Республики Беларусь | Производственное республиканское ремонтно-монтажное дочернее унитарное предприятие «Брестлифт» РУП «Брестлифт» Министерство жилищно-коммунального хозяйства Республики Беларусь | Республиканское мостостроительное унитарное предприятие «Мостоотряд № 425» РМУП «Мостоотряд № 425» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Издательско-полиграфическое республиканское унитарное предприятие «Промпечать» РУП «Промпечать» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Борисовский завод медицинских препаратов» РУП «Борисовский завод медицинских препаратов» Белорусский государственный концерн по производству и реализации фармацевтической и микробиологической продукции | Республиканское унитарное предприятие «Столинсортсемовощ» РУП «Столинсортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 220033, г. Минск, пр-т Партизанский, 31, пом. 4-16 | 247675, Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Белинского, 54а | 224024, г. Брест, ул. Красногвардейская, 129/1 | 210001, г. Витебск, ул. Мясникова, 3 | 220049, г. Минск, ул. Черняховского, 3 | 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 64/27 | 225149, Брестская обл., г. Столин, ул. Дзержинского, 100 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей | Разборка и снос зданий, строительство зданий и инженерных сооружений, производство столярных изделий и деревянной тары, производство товарного бетона | Ремонт и техническое обслуживание подъемного и такелажного оборудования | Строительство инженерных сооружений | Полиграфическая деятельность | Производство фармацевтических препаратов и материалов, лекарственных препаратов для ветеринарии | Розничная и оптовая торговля семенами и удобрениями |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 2203306, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 |
| Численность работающих, чел. | 85 | 134 | 484 | 298 | 55 | 2110 | 7 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 839 355 674 | 1 148 932 400 | 3 787 528 800 | 4 041 866 | 494 577 600 | 133 786 180 000 | 58 649 250 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 333 921 063 | 987 183 959 | 2 654 871 199 | 2 244 794 | 428 058 797 | 93 366 020 821 | 173 657 018 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 0,05835 | 0,44 | 1,865 | 12,94 | 0,164 | Завод – 10,208 Филиал (СПК) – 2 944,6634 | 0,35 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет | нет | 7 709 020 | нет | нет | 23 004 641 897 | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, рублей | нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 315 989 320 | 299 444 839 | 762 566 923 | 883 546 | 108 578 305 | 15 866 412 634 | 23 337 336 |
| Задолженность кредиторская | 432 179 307 | 1 181 336 066 | 1 024 834 868 | 845 857 | 186 434 310 | 13 843 081 771 | 115 007 768 |
| Задолженность дебиторская | 78 223 503 | 113 120 968 | 1 281 998 407 | 924 761 | 69 683 908 | 3 451 923 620 | 5 100 840 |

| Республиканское дорожно-строительное унитарное предприятие «ДСУ № 64» РУП «ДСУ № 64» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Производственно-техническое республиканское унитарное предприятие «Промстройсистема» РУП «Промстройсистема» Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь | Строительное пусконаладочное республиканское унитарное предприятие «Трест Белпромналадка» УП «Трест Белпромналадка» Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь | Производственное республиканское унитарное предприятие «Завод Минскагропроммаш» РУП «Завод Минскагропроммаш» Министерство промышленности Республики Беларусь | Проектно-технологическое республиканское унитарное предприятие «Сельхозтехпроект» РУП «Сельхозтехпроект» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие ордена «Знак почета» «Автокомбинат № 4» РУП «Автокомбинат № 4» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Производственное республиканское унитарное предприятие «Дзержинский экспериментально-механический завод» ПРУП «ДЭМЗ» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское производственно-сельскохозяйственное унитарное предприятие «Жлобинская птицефабрика» РПСУП «Жлобинская птицефабрика» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 222120, Минская обл., г. Борисов, пр. Революции, 9 | 220033, г. Минск, пр. Партизанский, 2, к. 502 | 220013, г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, 8 | 220089, г. Минск, ул. Глаголева, 39а | 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 | 220102, г. Минск, Социалистическая, 26 | 226720, Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46 | 247220, Гомельская обл., Жлобинский р-н, д. Солоное, ул. Садовая, 52а |
| Строительство дорог, аэродромов и спортивных сооружений | Деятельность в области архитектуры | Монтаж, наладка, ремонт и техническое обслуживание электротехнических станций и подстанций 0,4-330 кВ, систем управления и защиты, средств измерений и контрольно-измерительных приборов, паровых и водогрейных котлов, насосов и компрессоров | Производство дорожных и землеройных машин | Разработка всех разделов проектной документации для строительства или реконструкции зданий и сооружений, авторский надзор за строительством | Перевозка пассажиров и грузов автомобильным, внутренним водным, морским транспортом | Производство строительных металлоконструкций, автомобильных кузовов, прицепов и полуприцепов, прочих транспортных средств и оборудования | Производство мяса птицы |
| Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| 181 | 23 | 392 | 96 | 66 | 208 | 466 | 136 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 5 465 505 209 | 151 769 200 | 3 511 208 800 | 4 541 710 800 | 376 415 600 | 7 557 000 000 | 10 082 987 200 | 12 402 654 000 |
| 3 779 099 919 | 100 958 175 | 1 654 322 222 | 4 138 731 644 | 242 457 805 | 8 401 277 057 | 9 229 954 152 | 14 954 378 537 |
| 6,3499 | нет | 4,4787 | 2,3443 | нет | 7 262,2 | 9,0 | 957,0409 |
| нет | 375 | 17 580 689 | 7 600 000 | нет | 137 667 084 | нет | 1 026 000 |
| 6 059 120 | нет | нет | 121 927 | нет | нет | нет | нет |
| 852 607 398 | 36 318 141 | 959 495 106 | 139 590 464 | 142 929 427 | 7 508 122 | 1 811 210 615 | 780 122 012 |
| 752 993 445 | 232 073 391 | 1 284 861 563 | 645 402 140 | 724 013 126 | 462 745 592 | 2 948 208 356 | 2 835 489 025 |
| 1 193 816 503 | 17 520 132 | 208 766 454 | 120 202 096 | 403 957 627 | 849 111 467 | 317 920 576 | 560 130 623 |

# Краіна здароўя

Выпуск № 56 (112)

## Вірусы грыпу актывізуюцца?

**У кантрольных гарадах Беларусі зарэгістравана 48 496 выпадкаў захворвання на грып і вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі.**

Па звестках Нацыянальнага цэнтра па грыпу, у хворых на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі грып А быў лабараторна пацверджаны ў 19 працэнтах выпадкаў, а грып В — у 8 працэнтах выпадкаў. У 14,5 працэнта выпадкаў прычынай захворвання стаў парагрып, у 45 працэнтах — адэнавірусная інфекцыя і ў 13 працэнтах — змешаная інфекцыя. Такім чынам, калі раней у «вірусным пейзажы» пераважала адэнавірусная інфекцыя, то апошнім часам спецыялісты канстатуюць паступовую актывізацыю вірусаў грыпу.

У Еўропе, дарэчы, спарадычная актыўнасць грыпу была зарэгістравана ў Чэхіі, Даніі, Англіі, Венгрыі, Ірландыі, Нідэрландах, Нарвегіі, Партугаліі, Іспаніі, Швецыі і Швейцарыі. Аднак у цэлым захваральнасць на грып застаецца ва ўсіх еўрапейскіх краінах на неэпідэмічным узроўні.

Да 1 снежня ў Беларусі павінна была завяршыцца бясплатная імунізацыя супраць грыпу асобаў з так званых груп рызыкі. Усяго, па інфармацыі рэспубліканскай санэпідслужбы, ад грыпу было прышчэплена 674 276 чалавек.

У Мінску проціграпознай вакцынацыяй былі ахоплены каля 160 тысяч чалавек, у тым ліку 50 тысяч дзяцей і 110 тысяч дарослых — 9 працэнтаў усяго насельніцтва горада. Летась прышчэпкамі супраць грыпу былі ахоплены каля 120 тысяч чалавек, або 7 працэнтаў гараджан. 90 тысяч чалавек, ахопленых сёлета бясплатнай вакцынацыяй, аднасяцца да так званых груп рызыкі ўзнікнення цяжкіх наступстваў пасля перанесенага захворвання і да кантынгенту высокай рызыкі заражэння грыпам. Да таго ж у сталіцы бясплатна былі вакцыніраваныя каля 35 тысяч дзяцей, якія наведваюць дзіцячыя дашкольныя ўстановы і пачатковыя класы, а таксама 17 тысяч дарослых, якія забяспечваюць жыццядзейнасць горада: работнікі грамадскага транспарту, энергазабеспячэння, водазабеспячэння і іншыя.

Цяпер у сталіцы актыўна праводзіцца вакцынацыя работнікаў за сродкі прадпрыемстваў і установаў: у 150 арганізацыях прышчэпкамі ахоплены 17 тысяч чалавек. Працягваецца імунізацыя гараджан за ўласныя сродкі. Зрабіць прышчэпку на платнай аснове пажадалі ўжо 4 тысячы мінчан.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Русалкі ў Мінску

**Міжнародныя спаборніцтвы па плаванні ў ластах "Кубак Садружнасці-2008" ў спартыўным комплексе "Алімпійскі" прайшлі 5—7 снежня ў другі раз. У адкрытым чэмпіянаце і першынстве СНД удзел узялі больш за 200 спартсменаў з дзевятнаццаці камандаў Расіі, Літвы, Украіны і Беларусі.**

Жаночае здароўе

## ДА МАЛОЧНАЙ ЗАЛОЗЫ — З САМААГЛЯДАМ

**Замежныя даследчыкі сцвярджаюць: штодзённае ўжыванне 3 «дрынкаў» — 3 кубкаў віна або 50 г гарэлкі — павялічвае рызыку развіцця раку малочнай залозы.**

Дарэчы, рызык, якія спрыяюць развіццю памянёнага раку, даволі шмат. І яны ўсё больш інтэнсіўна «ўздзейнічаюць» на сучасных жанчын. І калі 35 гадоў назад у год выяўлялася 800 новых выпадкаў захворвання, то ў апошнія пяць гадоў стабільна не менш як 3,5 тысячы жанчын і каля 30 тысяч мужчын. Самы высокі ўзровень захворвання на сёння захоўваецца ў Скандынаўскіх краінах (140 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва) і ЗША (135 на 100 тысяч). У нашай краіне гэты паказчык роўны 65 на 100 тысяч. Аднак, тэндэнцыя да росту, безумоўна, ёсць, а значыць, кожная сучасная жанчына павінна ўзброіцца адпаведнымі ведамі.

Паводле слоў Леаніда ПУТЫРСКАГА, кіраўніка аддзела онкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, паўплываць на высокі ўзровень захворвання не ўдаецца ніводнай краіне свету. Сапраўды, асноўныя прычыны захворвання на рак малочнай залозы можна падзяліць на тры групы.

**Першая група.** Фактар нервовай узбуджанасці, перагрузак, стрэсу. Даказана, што мастапатыя і рак малочнай залозы цесным чынам звязаны з «нервамі».

**Другая група.** Дзетародная і гарманальная функцыі. Рызыка зніжаецца, калі менструальны перыяд пазней пачынаецца і пазней заканчваецца, калі першыя роды прыпадаюць на 20-гадовы ўзрост, калі грудное выкормліванне доўжыцца не менш за 6 месяцаў. Павялічваюць рызыку дысфункцыі яечнікаў, запаленчыя захворванні, бясплоднасць. Спрыяюць раку і пэўныя парушэнні ў рабоце шчытападобнай залозы і печані.

**Трэцяя група.** Навакольнае асяроддзе. Да гэтай групы адносіцца, напрыклад, узрост, паколькі з гадамі назапашваецца ўздзеянне адмоўных фактараў (сярэдні ўзрост узнікнення раку малочнай залозы — 50—52 гады, хоць апошнім часам абавязкова сярод такіх пацыентак сустракаюцца і тыя, каму менш за 30 гадоў). У гэту групу ўваходзіць і фактар спадчыннасці. Павялічваецца рызыка і ў жанчын высокага росту, якія ў перыяд менапаўзы пачалі актыўна мажнець. Дарэчы, актыўны рух — не менш за 5 гадзін на тыдні — у 1,5 раза зніжае як рызыку развіцця захворвання, так і магчымы рэцыдыў у тых, хто захварэў.

У трэцюю групу можна ўключыць і неспрыяльнае ўздзеянне частай змены клімату (некалькі разоў на год), і не лепшы «клімат» буйных гарадоў, і ненатуральнасць прадуктаў харчавання. Дарэчы, паводле расійскіх звестак, у некаторых прадуктах харчавання вучоным удаецца адшукаць ад 100 да 200 шкодных дамешкаў. Дрэнную паслугу могуць аказаць і тугія бюстгальтары, якія парушаюць кровазварот у тканках.

— Нельга паўплываць на захворванне, але можна — на запушчанасць, — кажа Леанід Путырскі. — За дзесяць гадоў колькасць запушчаных выпадкаў раку скарацілася на 46 працэнтаў... А што такое ранняе выяўленне? Гэта магчымасць захавання малочнай залозы і... жыцця...

Ранняму, на 1-2 стадыях, выяўленню раку малочнай залозы можа паспрыяць вылучэнне «груп рызыкі». Гаворка ідзе ў першую чаргу аб выпадках, абумоўленых спадчыннасцю. Праўда, іх нельга блытаць з ракам «сямейным», калі члены адной сям'і хварэюць не па прычыне генетыкі, а з-за пэўных умоў, пад уздзеяннем якіх знаходзяцца адразу некалькі чалавек.

Адной з характэрных рыс спадчыннага раку з'яўляецца ранні — 40-45 гадоў — узрост хворай. Сем'і, у якіх на працягу некалькіх пакаленняў выяўляецца рак малочнай залозы, трапляюць у поле зроку спецыялістаў РНПЦ анкалогіі. Па ўзоры крыві там сёння выяўляюць, у каго са сваякоў ёсць пэўная генетычная мутацыя. Пры наяўнасці апошняй верагоднасць узнікнення раку малочнай залозы складае 90 працэнтаў, акрамя таго, да 60 працэнтаў узрастае рак яечнікаў, страўнікава-кішачнага тракту, галавы і шыі. Тыя ў каго выяўляюць мутацыі, трапляюць пад назіранне. Гэта дазваляе выявіць перадпухлінны стан і лячыць яго.

Што ж датычыцца ўсіх астатніх жанчын, то яны абавязаны ўвесці ў практыку звычайныя самаагляды, і пры ўзнікненні нейкіх пытанняў тэрмінова паказвацца ўрачу-анколагу або гінеколагу па месцы жыхарства. Аднак можна звярнуцца і ў кабінет платных паслуг РНПЦ анкалогіі, што ў Бараўлянах.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Медыцына плюс інфармацыйныя тэхналогіі

**Адзіная сетка тэлемедыцыны, здольная ў будучым ахапіць усю тэрыторыю краіны, ствараецца цяпер у Беларусі. Восем месяцаў таму адбылося першае пасяджэнне рабочай групы па арганізацыі партнёрскага праекта развіцця тэлемедыцыны, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, Беларускага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, НДІ анкалогіі, Нацыянальнай Акадэміі навук, СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы», Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і ПРААН.**

За прайшоўшы час адным з галоўных дасягненняў стаў перавод тэлемедыцыны з узроўню тэхналогіі навучання і набыцця вопыту на ўзровень рэальнай дапамогі жыхарам аддаленых куткоў Беларусі.

— Тэлемедыцына — гэта дастаткова новы напрамак, які знаходзіцца на скрыжаванні некалькіх галінаў: медыцыны, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, — каментуе начальнік упраўлення медыцынскай статыстыкі, справаводства і інфармацыйных тэхналогій Міністэрства аховы здароўя Барыс Андрасюк. — Дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям, якія выкарыстоўваюцца ў тэлемедыцыне, яе распаўсюджванне набліжае магчымасць атрымання апаратыўнай дапамогі да хворых, якія пражываюць у раёнах, тэрытарыяльна аддаленых ад кансультацыйных цэнтраў, і зніжае выдаткі на лячэнне пацыентаў. Ёсць захворванні, якія патрабуюць тэрміновай кансультацыі спецыяліста, якую мясцовы ўрач не можа аказаць. А тэлемедыцына дазваляе ўрачам абменьвацца інфармацыяй у фармаце «он-лайн» — рэнтгенаўскімі здымкамі, камп'ютарнымі тамаграмамі, кардыяграмамі. Стварэнне сеткі цяпер рухаецца ад сталіцы да рэгіёнаў. І самая важная задача на сённяшнім этапе — стварэнне інфраструктуры тэлемедыцыны ў рэгіёнах: закупка абсталявання, навучанне спецыялістаў і перавод работы з пацыентамі на новыя «рэйкі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## САЛЯРЫЙ: галоўнае — ведаць меру

**Чалавек заўсёды любіў сонца, імкнуўся да яго ў цёплыя краіны — адпачыць і загарэць. Сёння няма неабходнасці ляцець за сонечнымі прамянямі ў далёкія краі. Загараць можна прама тут, у горадзе, нават калі на вуліцы ідзе снег і тэмпература зусім не спрыяе сонечным працэдурам. Гаворка ідзе пра салярыі, якія даюць магчымасць мець прыгожы загар дванаццаць месяцаў запар.**

На жаль, для некаторых прадстаўніц цудоўнай паловы чалавецтва шакаладнае адценне скуры становіцца ледзь не мэтай жыцця, яны прысвячаюць гэтаму свой час, грошы і... здароўе. Для іх нават быў прыдуманы тэрмін «танарэксія» — хваравітая, амаль маніякальная страсць да загару незалежна ад пары года. (Найбольш схільныя да яе дзяўчаты ва ўзросце 13—16 гадоў.) Асабліва актуальнай гэта праблема становіцца, калі ўлічыць шырокае распаўсюджанне ўсялякіх салярыяў — ад стацыянарных прафесійных да хатніх. Менавіта ў салярыях «загараманкі» інтэнсіўна падтрымліваюць сваю форму круглы год, не звяртаючы ўвагі на перасцярогі медыкаў. Апошнія папярэджваюць: злоўжыванне сонечнымі ваннамі (як на прамым сонцы, так і ў салярыях) наносіць значную шкоду ўсяму арганізму, садзейнічае развіццю ракавых хваробаў скуры і ўвогуле адмоўна адбіваецца на яе стане, яна хутка старэе і пакрываецца маршчынамі.

Праўда, ад загару ў салярыі ёсць і карысць. Ультрафіялет стымулюе выпрацоўку вітаміну D, які адказвае за засваенне арганізмам кальцыю і фосфару, ад чаго залежыць трываласць мышцаў і касцей; актывізуе абменныя працэсы ў арганізме; дапамагае змагацца з захворваннямі дыхальных шляхоў; лечыць экзэму, псарыяз, вугровы сып, грыбковыя пашкоджанні; падрыхтоўвае скуру да актыўнага летняга сонца (асабліва карысна прыняць некалькі сеансаў перад паездкай да мора). Спецыялісты таксама сцвярджаюць, што пад уздзеяннем ультрафіялету ў чалавечым арганізме выпрацоўваюцца так званыя гармоны шчасця — эндарфіны, таму людзі пасля салярыя адчуваюць сябе супакоенымі і шчаслівымі. І яшчэ адзін важны псіхалагічны фактар: вы загарыце, а значыць, будзеце цудоўна выглядаць, падабацца сабе і навакольным.

Такім чынам, наведваць салярый ці не — вырашаць вам. Ну, а калі вы ўсё-такі захочаце пазагараць зімой, перш-наперш пракансультуйцеся ва ўрача. Бо існуюць захворванні, пры якіх процiпаказаны любы загар: гіпертанія, атэрасклероз, цукровы дыябет, парушэнні ў рабоце шчытападобнай залозы, гінекалагічныя і анкалагічныя хваробы, вітыліга, туберкулёз, частыя прыступы бранхіяльнай астмы і інш.

Не рэкамендуецца загараць і пры прыёме некаторых лекаў. Гэта ў асноўным датычыцца транквілізатараў, антыбіётыкаў, мачагонных сродкаў, гарманальных прэпаратаў, якія павышаюць святлоадчувальнасць скуры і могуць справакаваць алергію. Урачы не раяць чаргаваць наведванне салярыя з саўнай, а таксама ўстрымацца ад загарання пры прастудзе і павышанай тэмпературы. Акрамя таго, загар у салярыі процiпаказаны дзецям да 15 гадоў і людзям, якія маюць на целе шмат радзімак. Цяжарныя жанчыны таксама павінны быць вельмі асцярожнымі: ёсць рызыка развіцця хлаазмы (пігментных плямаў).

Калі ўрач даў «дабро» на прынясце сонечных ваннаў, другая ваша задача — як мага больш уважліва паставіцца да выбару салярыя. Салярыі бываюць гарызантальныя і вертыкальныя. У апошніх мноства пераваг: і загар атрымліваецца больш раўнамерным, і свабода рухаў прысутнічае, і, нарэшце, гэта проста гігіенічна, бо вы не дакранаецеся да паверхні апарата. У гарызантальным жа вы можаце расслабіцца і паляжаць. Дарэчы, абавязковым правілам для ўсіх салярыяў з'яўляецца апрацоўка паверхні лежака спецыяльным дэзраствoрам пасля кожнага наведвальніка. Праверыць, зроблена гэта ці не, вельмі лёгка: калі ляжак не выцерлі, на празрыстай паверхні выразна відаць плямы і рагі, якія засталіся пасля папярэдняга сеанса. Калі ж не жадаеце «падсмажвацца» з ног да галавы, а пахваліцца смуглай скурай хочацца — сядайце ў крэсла-салярый. У ім загараюць толькі даступныя воку часткі цела — рукі, твар і зона дэкальтэ. Назва «турба-салярый» азначае, што апарат для загару абсталяваны сістэмай вентыляцыі, якая пазбаўляе ад спякоты і духаты ў кабінцы.

### ПРЫМІЦЕ ДА ВЕДАМА

- Працягласць знаходжання пад «штучным сонцам» дыктуецца тыпам скуры. Людзі з малочна-ружовым адценнем скуры, мноствам вяснушак, рыжымі або светла-русымі валасамі (так званы кельцкі тып) загараюць вельмі дрэнна і больш за ўсіх рызыкуюць атрымаць апёкі, таму ім лепш не наведваць салярый.
- Пачынаць апрамяненне трэба з мінімальных дозаў, паступова іх павялічваючы. (Максімальны час сеанса — 20 хвілін.) Працягласць першай працэдуры варта скараціць удвая, каб праверыць адчувальнасць скуры. Памятайце, што апёк, атрыманы ў салярыі, вельмі балючы, і рана ад яго можа застацца надоўга. Калі пасля першых сеансаў у вас з'явіўся нейкі сып, сталі павялічвацца радзімкі, наведванне салярыя трэба спыніць і неадкладна звярнуцца да ўрача.
- Рэгулярнае апрамяненне не павінна перавышаць двух разоў на тыдзень або 30 працэдур на год. Час ад часу неабходна рабіць перапынак на месяц-паўтара, каб даць скуры магчымасць аднавіцца.
- Для салярыя не падыходзяць звычайныя «пляжныя сродкі» з сонцаахоўнымі кампанентамі. Тут патрэбны спецыяльныя — для штучнага загару. Яны не змяшчаюць UV-фільтраў, але багатыя на ўвільгатняльныя дабаўкі, якія папярэджваюць перасыханне скуры, а таксама рэчывы, якія ўзмацняюць загар.
- Перад паходам у салярый пажадана не мыцца з мылам, якое пазбаўляе скуру тлушчавай змазкі, што павялічвае верагоднасць апёку. У ідэальным варыянце варта памыцца за дзве гадзіны да працэдуры або, калі вы прымаеце душ непасрэдна перад загараннем, замяніць мыла на больш ашчадную вадкую пену.
- Каб засцерагчы сябе ад алергіі, перад сеансам старанна змыйце макіяж, не карыстайцеся духамі, дэзадарантамі, пахкім алеем, зніміце біжутэрыю і ўпрыгажэнні.
- Памятайце: загар у вобласці грудзей вельмі шкодны, таму іх трэба беражліва прыкрываць баваўнянымі накладкамі.
- У салярыі пажадана выкарыстоўваць спецыяльныя непранікальныя акуляры, бо звычайных сонцаахоўных (няхай нават вельмі цёмных) — недастаткова. Калі вы носіце кантактныя лінзы, то перад працэдурай іх неабходна зняць.
- Каб пазбегнуць перасыхання валасоў, надзеньце шапачку або хусцінку. Яшчэ адно далікатнае месца — скура вуснаў, змажце іх ахоўным бальзамам.
- Пасля працэдуры нанясіце на скуру лёгкі пажыўны або ўвільгатняльны крэм. Ні ў якім разе не выходзьце адразу на сонца, лепш пасядзіце, адпачніце. Добра выпіць кубачак травяной гарбаты або соку.

Трымайцеся залатога правіла: «Ва ўсім важная мера» — і салярый прынясе вам толькі карысць.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## З'ЕЎ І ЗАХВАРЭЎ

Бяспечнае харчаванне

**Ахвярамі паляўнічага сезона ў пачатку гэтага года сталі 14 чалавек у Гарадоцкім раёне, якія пакаштавалі мяса дзіка, і 9 — у Гродне і Гродзенскім раёне, што пачаставаліся хатняй свежанінай. А прычынай захворвання на трыхінілёз стала традыцыйнае ўхіленне ад паслязабойнай ветэрынарнай экспертызы.**

У кастрычніку адкрыўся чарговы паляўнічы сезон. А з яго адкрыццём медработнікі пачынаюць адлічваць перыяд сезоннага павелічэння выпадкаў заражэння такім небяспечным для чалавека гельмінтам, як трыхінілёз.

— Прадоўжыцца гэты перыяд усю зіму і большую частку вясны і будзе звязаны не толькі з паляваннем на дзікоў і ўжываннем іх мяса, але і з масавым забоем свіней у прыватным сектары, асабліва ў перадкалядныя дні, — расказвае **ўрач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ**.

Заражэнне людзей адбываецца пры ўжыванні заражанага мяса дзікоў або свойскіх свіней; тыя ж у сваю чаргу заражаюцца, паядаючы мышэй, пацукоў, трупы драпежных жывёл або адходы паляўнічага промыслу.

Лічынкі трыхінілёзу вызначаюцца асаблівай устойлівасцю да неспрыяльных фактараў: ні варка, ні смажанне, ні вэнджанне, ні саленне ў поўнай меры не вызваляюць ад іх мясапрадукты. Праявы захворвання звычайна з'яўляюцца праз 2—4 тыдні з моманту заражэння, але могуць з'явіцца і праз некалькі дзён. Усё залежыць ад атрыманай дозы ўзбуджальніка і ўстойлівасці самога арганізма чалавека. Праяўляецца хвароба ў выглядзе так званай «трыяды» сімптомаў: высокая тэмпература (да 39 °С і вышэй), мышачныя болі лытачнаножнай вобласці і ацёкі павек, твару. Нездарма ў народзе трыхінілёз называюць яшчэ «адутлаваткай». Часам да гэтай трыяды далучаюцца скураныя высыпкі і кішэчныя расстройствы.

— Галоўным у сістэме папераджальных мерапрыемстваў з'яўляецца асабістая прафілактыка заражэння, — падкрэслівае А. Ведзянькоў. — Нельга набываць прадукты харчавання (у гэтым выпадку мясапрадукты) у невядомых асобаў, па-за дзяржаўнымі пунктамі гандлю — гэта можа выклікаць харчовыя атручэнні і розныя іншыя захворванні. Купляючы ж мяса ў камерцыйных ларках і палатках, пытайцеся даведку аб ветэрынарным даследаванні прадуктаў.

Памяшканні, у якіх утрымліваецца жывёла на ўласным падворку, павінны быць забяспечаны абаронай ад пранікнення грызуноў. Перыядычна — вясной і восенню — трэба адлоўліваць і знішчаць пацукоў і мышэй у жылых і прысядзібных пабудовах. Нельга скормліваць свойскім свінням трупы загінулых дзікіх жывёл, а адходы паляўнічага промыслу — толькі пасля папярэдняй ветэрынарнай экспертызы іх бяспекі.

Яшчэ адна мера прафілактыкі. Трэба абавязкова праводзіць паслязабойную ветэрынарную экспертызу туш свойскіх свіней і дзікоў — і толькі пасля гэтага ўжываць іх мяса. Прычым для правядзення такой экспертызы не трэба везці ў ветэрынарную ўстанову ўсю тушу — дастаткова адабраць пробу мышачнай тканкі (з ножак, дыяфрагмы, міжрэберных, шыйных, жавальных або лытканожных мышцаў) вагой не больш як 50 грамаў. Акрамя таго, для зручнасці насельніцтва ветэрынарная служба рэспублікі прыцягвае да правядзення трыхінеласкапічнай экспертызы ветэрынарных урачоў жывёлагадоўчых гаспадарак.

Варта памятаць, што даследаваць мяса не позна і праз тыдзень пасля ўжывання свежыны. Калі і знойдуцца лічынкі трыхінел, захворванне можна будзе прадухіліць, своечасова звярнуўшыся ў медыцынскую ўстанову па месцы жыхарства, дзе прызначаць прафілактычнае лячэнне. Галоўнае — не спяшайце частаваць скваркай родных і знаёмых.

**Вольга ШАЎКО.**

Лад жыцця

## Дажыць да старасці не ў маразме, а ў радасці

**Сталенне — гэта, безумоўна, зніжэнне магчымасцяў арганізма, паслабленне здароўя, упадак фізічных сілаў, пагружэнне ва ўнутраны свет, перажыванні, звязаныя з ацэнкай і асэнсаваннем пражытага жыцця... Старасць — гэта тое, што непазбежна для тых, хто хоча жыць як мага даўжэй. Але старасць старасці не роўная. Яна можа быць сапраўды змрочнай як для самога чалавека, так і для яго блізкіх, а можа стаць часам дасягнення мудрасці, адчування выкананага абавязку, момантам адпачынку і сузірання... Што ж, многае ў нашых руках. Было б жаданне зрабіць сваё доўгае жыццё як мага больш радасным, а накірунак... укажуць спецыялісты.**

**Загадчык псіхагерыятрычнага аддзялення Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Аляксандр ГОЛУБ растлумачвае пэўныя асаблівасці сталага ўзросту і дае адпаведныя карысныя парады.**

1. Трансфармацыі ў псіхічнай галіне датычацца перш за ўсё змяненняў памяці, увагі, мыслення і некаторых іншых функцый. Зніжэнне памяці назіраецца не ва ўсіх, больш за тое, у абсалютнай большасці сталых людзей мае быць нязначнае паслабленне гэтай функцыі. Пагаршэнне звязана не столькі з запамінаннем новай інфармацыі, колькі з «выцягваннем» яе з памяці. Змяненне ўвагі праяўляецца ў аслабленні кантролю над звыклымі сігналамі, якія ўказваюць на неабходнасць улічваць навакольную сітуацыю, а таксама ў такой распаўсюджанай з'яве, як рассеянасць, калі блытаецца паслядоўнасць дзеянняў, думкі «скачуць».

- Майце на ўвазе, што адукаванасць і патрэба ў навучанні станоўча ўплываюць на інтэлект. Адукаваныя, начытаныя людзі лепей разумеюць прыроду старасці і больш эфектыўна спраўляюцца з новымі патрабаваннямі жыцця. Трэніруйце памяць, пастаянна спасцігайце штосьці новае.

2. Пажылыя людзі перажываюць крызіс, звязаны з пераацэнкай пражытага жыцця, выхадам на пенсію, змяненнем сацыяльнага статусу і стылю жыцця.

- Здаровая старасць звязваецца з прыняццем свайго шляху, а хваравітая — са спачуваннем і сорамам за гады, пражытыя без мэты.

3. Павялічваецца не толькі фізічная, але і эмацыянальная залежнасць ад іншых людзей. Сталаму чалавеку неабходна адчуваць сябе патрэбным сям'і, дзецям, унукам, валодаць магчымасцю служэння іншым людзям, перадачы свайго прафесійнага і жыццёвага вопыту.

- Ідэальны варыянт — быць на гэты момант у шлюбе, мець добрыя ўзаемаадносіны з дзецьмі, суседзямі, сябрамі. Неабходна паступаць так, каб вашай парады чакалі і да яе прыслухоўваліся. Вазьміце на сябе частку бытавых абавязкаў, каб блізкія не ўспрымалі вас як абузу. Калі можаце працаваць — працуйце. Ёсць магчымасць наведваць які-небудзь гурток або браць удзел у грамадскім жыцці — наведвайце і прымайце. Забірайце дзяцей са школы, гатуйце, вырошчвайце кветкі, уладкоўвайце дачны ўчастак... Адным словам, не бойцеся нагружаць сябе.

4. Працягласць жыцця, знешні выгляд і самаадчуванне ў многім залежаць ад правільнага харчавання. Пры няправільным тагсіны хутчэй назапашваюцца ў клетках і значна павольней нейтралізуюцца. Да заўчаснага старэння прыводзяць пераяданне, няякасная ежа — паўфабрыкаты, фарбавальнікі, салодкае, тлустае, салёнае, — нерэгулярнае харчаванне, звычка вячэраць непасрэдна перад сном. З другога боку, і аскетызм, сядзенне на дыетах, аднастайны рацыён прыводзяць да заўчаснага старэння арганізма.

- Змяншайце аб'ём порцый, зніжайце спажыванне жывёльных тлушчаў, адсочвайце калорыйнасць прадуктаў, імкніцеся прымаць ежу рэгулярна, прыблізна ў адзін і той жа час.

5. Працягласць жыцця залежыць ад генетыкі. Аднак нават калі вам дасталіся моцнае цела і ясны розум, не забывайцеся на здаровы лад жыцця. Курэнне і злоўжыванне алкаголем наносяць непапраўны ўрон здароўю. Калі жыццё ў такіх выпадках і бывае працяглым, то гаварыць аб яго якасці ўжо не даводзіцца.

- Пазбаўцеся дрэнных звычак — не курыце і часцей адмаўляйцеся ад выпіўкі без нагоды, каб не стаць закладнікам алкагалізму. Алкаголь перш за ўсё наносіць шкоду клеткам мозга, таму ў людзей, якія злоўжываюць моцнаградуснымі напоямі, часцей развіваюцца зніжэнні інтэлекту — дэменцыі.

6. Рух — вось што дапамагае прафілактаваць многія захворванні, надае бадзёрасці, не дапускае песімістычных думак, сумных настрояў.

- Штодзённыя працяглыя прагулкі — не менш за гадзіну, простыя фізічныя практыкаванні зробяць вас больш маладымі.

7. Старэнне — непазбежнасць. Смерць, як вядома, надыходзіць не з-за гэтай непазбежнасці, а з-за пэўных захворванняў.

- Своечасова выяўляйце і лячыце захворванні, ніколі не захапляйцеся самалячэннем, вытрымлівайце ўрачэбныя рэкамендацыі, і тады зможаце разважаць над тым, чаму менавіта можна радавацца ў старасці. Таму, напэўна, што вы да гэтай старасці дажылі. Вы малайчына!

**Запісала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПАЛАЮЧАЕ ВІНО

Здароўе на талерцы

**Калі за акном непагадзь, а раннія прыцемкі навяваюць нуду, няма нічога лепшага, чым цёплая бяседа ў коле сяброў. А ў сяброўскай кампаніі няма нічога лепшага за гарачыя напоі. Ну, чай, кава — да іх мы ўсе прызвычаіліся. Для асаблівых жа выпадкаў і вечарынак больш падыдуць гарачыя слабаалкагольныя напоі. Адзін з іх — глінтвейн.**

Глінтвейн з нямецкай мовы перакладаецца як «палаючае віно», гэта значыць падагрэтае. Звараны на аснове натуральнага віна з дабаўленнем соку, садавіны, вострых прыпраў, глінтвейн — самы што ні ёсць зімовы напой. Ён карысны ў перыяд аднаўлення пасля інфекцыйных захворванняў, пры фізічным і псіхічным знясіленні. Пры ўмераным ужыванні (адзін-два келіхі) глінтвейн узбадзёрыць і ўзніме настрой, сагрэе пры прастудзе, пазбавіць ад насмарку і кашлю. (Натуральна, вялікая колькасць выпітага напою прынясе толькі стомленасць і ранішні галаўны боль.) Вострыя прыправы, што ўваходзяць у яго склад, стымулююць дзейнасць залозаў унутранай сакрэцыі. А натуральнае чырвонае віно — прызнаны сродак прафілактыкі халестэрынавых адкладанняў у сасудах і крывятворнае зелле.

Глінтвейн гатуецца лёгка і хутка. Для прыгатавання напою ідэальна падыходзіць не вельмі моцнае, чырвонае сухое або паўсухое віно. Вось рэцэпт класічнага глінтвейну: бутэлька чырвонага віна, 6—7 штук гваздзікі, мускатны арэх на смак, 1/3 шклянкі вады, 1 ст. лыжка цукру. (Гурманы любяць у гэты набор інгрэдыентаў дадаваць па некалькі кропель салодкага лікёру або каньяку — для паўнаты смаку.) Гваздзіку, мускатны арэх засыпаюць у турку, заліваюць вадой, даводзяць да кіпення і трымаюць на слабым агні адну хвіліну. Пасля гэтага адвар павінен настояцца 10 хвілін. Віно выліць у вогнетрывалую шкляную або керамічную пасудзіну і паставіць на агонь. У крыху падагрэтае віно ўліць змесціва туркі, прасачыўшы за тым, каб не трапіў асадак. Перамяшаць. Дадаць цукар, зноў перамяшаць і давесці на слабым агні да патрэбнай тэмпературы.

Вострыя прыправы можна падбіраць індывідуальна. Акрамя гваздзікі і карыцы, без якіх не абыходзіцца ні адзін глінтвейн, для напою падыходзяць аніс, імбір, кардамон, каляндра, лаўровы ліст, духмяны перац, шафран. Прыправы лепш браць не молатымі. Молатыя раствараюцца ў віне, з-за чаго з'яўляецца муць, якую немагчыма выдаліць, — і глінтвейн будзе сапсаваны.

Да месца ў глінтвейне розныя фрукты: скрылькі ананаса, долькі цытрусавых, кавалачкі груш і яблыкаў, вішні ды слівы (асабліва чарнасліў). Калі віно сухое, можна дадаць мёд. Апошні лепш падмяшаць у напой у самым канцы прыгатавання.

Памятайце: глінтвейн, як і кава, ні ў якім разе не павінен закіпець. Таму — для страхоўкі — зніміце яго з пліты проста дастаткова гарачым. (Аптымальная тэмпература — 70 °С.) Пасля гэтага напой трэба або адразу разліць па бакалах, або заліць у керамічны чайнік. Не забудзьце, што глінтвейн не пераносіць ахаладжэння: нагрэтае адзін раз віно ўжо назаўсёды страчвае свой букет і смакавыя якасці. Прыгатаваны глінтвейн можна захоўваць у звычайным тэрмасе (дарэчы, ад гэтага напой толькі выйграе: крыху загусцее і настоіцца). Адзіная ўмова — калі вы плануеце захоўваць яго больш за гадзіну, дастаньце цэдру лімона, інакш віно набудзе гаркаваты прысмак.

Піць гэты напой трэба гарачым з высокіх (каб менш астываў), пажадана празрыстых (каб палюбавацца насычаным колерам напою) шклянак з ручкамі. Тэмпература вызначаецца на смак. Яна павінна быць такой, каб гарачы глінтвейн можна было ўжываць, не атрымліваючы апёку.

Правільна прыгатаваны глінтвейн апякае смакам прыпраў і саграве ў доўгія зімовыя вечары.

### Белы глінтвейн

*Інгрэдыенты:* бутэлька белага віна, лімон, 100 г цукру, 125 мл вады, гваздзіка, карыца.

Цукар, гваздзіку, карыцу і долькі лімона пакласці ў пасудзіну, заліць вадой і давесці да кіпення. Настой працадзіць. Дадаць віно і падагрэць да належнай тэмпературы.

### Яблычны глінтвейн

*Інгрэдыенты:* чырвонае віно, 120 мл яблычнага соку, 1 ст. лыжка лімоннага соку, 2 шт. гваздзікі, карыца — на кончыку нажа, 1 кавалачак цукру.

Разагрэць, але не кіпяціць сумесь з яблычнага і лімоннага сокаў, чырвонага віна. Дадаць гваздзіку, карыцу і цукар. Гатовы глінтвейн працадзіць і падаваць у папярэдне нагрэтым кубку.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

